ПАЭЗІЯ НАРОДАЎ СВЕТУ

# Іван Скала

# *Вітаю вас, вокны!*



ПАЭЗІЯ НАРОДАЎ СВЕТУ

# Іван Скала

# *Вітаю вас, вокны!*

Вершы

Мінск
«Мастацкая літаратура»
1995

ББК 84(4Чеш)
С42
УДК 885.0-1

*Серыя заснавана ў 1971 г.*

Рэдкалегія:
Рыгор Барадулін, Васіль Зуёнак,
Васіль Сёмуха, Янка Сіпакоў, Максім Танк

Перакладзена з выданняў:
Skála I. Vybrané spisy. Svazky 1—4.: Praha: Československý spisovatel, 1984—1985.
Skála I. Kalendář.— Praha: Ceskoslovensky spisovatel, 1986. Skála I. Havran neriléta s kvétinou. — Praha: Československý spisovatel, 1988.

*Пераклад з чэшскай і прадмова Хведара Жычкі*

8850000000—046 / М 302 (03) — 95 112 — 95

ISBN 985-02-0098-7 (беларус.)

© Пераклад. Прадмова. Хв. Д. Жычка, 1995

# Шматколерная, як вясёлка, паэзія

Восенню 1972 года ў складзе пісьменніцкай дэлегацыі я ўпершыню наведаў Чэхаславакію. Добрая дзяўчына Здэнька, супрацоўніца апарата Саюза чэшскіх пісьменнікаў, пад-радзілася быць нашым гідам, павяла паказваць славутыя мясціны «Златай Прагі». На Карлавым мосце нам сустрэлася закаханая пара — хлопец і дзяўчына, узяўшыся за рукі, ішлі і ў такт сваім крокам напявалі:

Крочыш мостам ты з усмешкай,
крочыш мостам са слязамі,
крочыш мостам і мне сэрца
кожным крокам прабіваеш.

— «Кожным крокам прабіваеш»,— паўтарыла Здэнька і з гонарам паведаміла: — Гэта верш нашага найлепшага паэта Івана Скалы.

— А музыка чыя? — пацікавіўся нехта з нас.

— Нічыйная. Вершы яго і без музыкі спяваюцца. Самі.

Назаўтра паэт Іван Скала сустракаў нас у выдавецтве «Чэскаславенскі спісавацель», дзе ён працаваў дырэктарам. Ветлівы і сціплы да сарамлівасці. Галоўны рэдактар выдавецтва, таксама паэт, Ян Піларж пажартаваў:

— Івану ў гэтым месяцы спаўняецца пяцьдзесят гадоў, а ён і сам гэтаму не верыць, таму такі разгублены.

Тады ж Іван Скала і падарыў нам выдадзены да яго юбілею аднатомнік выбраных твораў «Ламікамень». У Доме творчасці «Добржыш» я разгарнуў кнігу, пачаў чытаць і ўжо не мог адарвацца, хоць чэшскую мову ведаў яшчэ слаба. Сапраўды, вершы Івана Скалы меладычныя, светлыя, задушэўныя, іх хочацца спяваць, нягледзячы на тое, што не ўсе яны напісаны класічнымі памерамі — аўтар добра валодае і белым вершам, і верлібрам. Яны простыя, але не спрошчаныя, у іх — і глыбокі падтэкст, і разважлівасць, і мудрасць багатага жыццёвым вопытам чалавека, натхнёнага палымянай любоўю да роднай зямлі, да працоўнага чалавека.

Іван Скала (сапраўднае імя — Карэл Гел) нарадзіўся 6 кастрычніка 1922 года ў невялічкім гарадку Брандысе на

Лабе ў сям'і слесара. Дзяцінства яго прайшло ў розных вёсках і гарадах, куды пераязджалі бацькі ў пошуках працы. Неўзабаве бацька застаўся зусім без працы, а маці памерла. Дзевяцігадовы хлапчук вяртаецца ў Брандыс, жыве ў дзядулі па матчынай лініі. Гэты куточак зямлі ў Палабскай даліне становіцца будучаму паэту «раднейшым за родны дом». Пазней Іван Скала ўславіць яго і вершамі, і прозай. Успамінаючы дзяцінства, паэт не скардзіцца на свой лёс, з замілаваннем піша пра матчыну пяшчоту і суровую дзедаву навуку, пра рэдкія дзіцячыя радасці на ўлонні прыроды і ў цесным дворыку на ўскраіне Прагі.

Нягледзячы на беднасць, яму ўдалося скончыць школу і паступіць у пражскую Гандлёвую акадэмію, тую самую, у якой у свой час вучыўся вядомы сатырык Яраслаў Гашак. Як і Гашак, Іван Скала не стаў камерсантам. Ён любіў маляваць, пісаў вершы, якія з 1939 года друкаваў у «Студэнцкім часопісе», альманаху «Хвала слова», марыў стаць літаратарам. Але пачалася вайна, і юнака вывезлі на прымусовую працу ў Германію, адкуль ён толькі ў сакавіку 1945 года змог уцячы і вярнуцца на Радзіму. Вярнуўся з яшчэ большай нянавісцю да фашызму, з новымі вершамі. Яны і склалі першы зборнік Івана Скалы — «Крэсіва», які ўбачыў свет у 1946 годзе.

У цяжкія пасляваенныя гады на ганарар за вершы пражыць было немагчыма, і Іван Скала становіцца журналістам, піша публіцыстычныя і крытычныя артыкулы для газет і часопісаў. Набірае моцы і яго паэзія. У 1948 годзе выходзіць другі зборнік вершаў Івана Скалы — «Цераз парог», у 1950 годзе — «Май маёй краіны».

У першых сваіх кнігах паэт па-юнацку шчыра, палка, з замілаваннем славіў прыгажосць вызваленай з фашысцкай няволі роднай зямлі, славіў дружбу і каханне, мір, стваральную працу вольнага чалавека. У творах было многа пафасу, але яшчэ малавата мастацкіх вартасцей, яны грашылі прамалінейнасцю, дэкларацыйнасцю. Гэта былі агульныя недахопы тагачаснай чэшскай паэзіі. Але ў тых, першых кнігах маладога аўтара крытыкі заўважылі адметнасць паэзіі Івана Скалы — смеласць думкі, вобразнасць, метафарычнасць, уменне адкрыта і смела глядзець у вочы, не затушоўваць адмоўнага .

Усеагульнае прызнанне прыйшло да паэта ў канцы пяцідзесятых — пачатку шасцідзесятых гадоў, пасля выхаду кніжак паэзіі «Ранішні поезд надзеі» (1958), «Вітаю вас, вокны!» (1962), «Вястун прыходзіць пеша» (1968). У гэтых кнігах паэт імкнецца адказаць на адвечныя пытанні чала-

вецтва: што такое добра і што такое дрэнна, зноў вяртаецца да тых вытокаў, з якіх чэрпаюцца жыватворныя сокі творчасці. І прыходзіць да высновы, што крыніцу паэзіі трэба шукаць у роднай зямлі, у народным жыцці.

Паэт заўсёды неаддзельны ад часу, у якім ён жыве. А Іван Скала надзелены яшчэ і здольнасцю ўлоўліваць нейкія непрыкметныя, але, як потым выявіцца, самыя галоўныя, самыя характэрныя рысы жыцця грамадства. Ён многа падарожнічае па свеце. Пашыраецца тэматыка яго творчасці: побач з лірыкай кахання і ўспамінамі пра дзяцінства і вайну з'яўляюцца творы філасофскага напрамку, творы — водгукі на трывожныя падзеі ў свеце. Становіцца больш разнастайнай і форма, багацейшай жанравая палітра. Уменне сказаць паэтычна пра самыя, здавалася б, празаічныя з'явы робіць яго паэзію папулярнай у народзе. Значнымі падзеямі ў чэшскай паэзіі, пераломнымі вехамі ў творчасці Івана Скалы з'явіліся зборнікі вершаў «Што бяру ў дарогу» (1975), «Агонь спяшаецца» (1979), «Бермудскі трохкутнік» (1982), «Каляндар» (1986), «Груган не прылятае з букетам» (1988). Іх чыталі як адкрыццё, пра іх пісалі ў друку, спрачаліся.

Дасягнуўшы паэтычнай сталасці, Іван Скала набірае творчую вышыню, а ў асваенні новых тэм, новых паэтычных вобразаў ён — прызнаны лідэр. За ім цяжка паспяваць і крытыкам і перакладчыкам. Кожная новая кніга Івана Скалы — гэта па сутнасці абсалютна новы паэт, не падобны да ўчарашняга і па змесце і па форме, хоць і з'яўляецца лагічным працягам папярэдняй творчасці.

Паэт Іван Скала не быў абдзелены ўвагай. Яму прысвоена ганаровае званне народнага мастака, тройчы яго кнігі адзначаліся дзяржаўнымі прэміямі, ён выбіраўся Першым сакратаром Саюза чэхаславацкіх пісьменнікаў (1959—1964), Старшынёй Саюза чэшскіх пісьменнікаў (1982—1989), пра яго творчасць напісаны даследаванні і манаграфіі.

Як вядома, чэхаславацкі варыянт «пабудовы сацыялізму» не быў дакладнай копіяй нашага «пераможнага шэсця да вяршыняў шчасця чалавецтва»,— іншыя нацыянальныя традыцыі, іншыя праявы нацыянальнай самасвядомасці народа, іншы ўзровень культуры ды і геаграфічнае размяшчэнне не дазвалялі партакратыі да канца апускаць «жалезную заслону», хутка, нахабна і на ўсю моц ажыццяўляць палітычны і эканамічны дыктат. Таму чэхі і славакі і ў той «застойны» час жылі значна багацей за нас і матэрыяльна, і духоўна. Але і ў іх ужо дзяржаўны арганізм раз'ядаўся

ржой фармалізму, бюракратызму, ашуканства, чынашанавання.

Няўрымслівая душа паэта не ўжывалася з казёншчынай, настойліва вырывалася з ідэалагічных рамак на шырокі прастор вольнай творчасці.

У Івана Скалы многа вершаў, прысвечаных тэме творчасці: аб ролі паэзіі ў жыцці чалавека, аб месцы паэта ў грамадстве. Яго роздум пра паэзію — гэта роздум пра жыццё, адказнасць не толькі паэта, а і грамадзяніна за ўсё прыгожае, добрае, светлае. Паэзія і паэт не могуць жыць пад прымусам, яны павінны быць вольнымі, несці святло людзям. Звяртаючыся да маладога паэта, Іван Скала раіць пісаць палымяныя радкі палымяным сэрцам:

Бунтуй і рвіся ў высі смела,
пі шчасця хмельную брую,
пакуль цвярозасць не раз'ела,
як лейкемія, кроў тваю.

Іван Скала перакананы, што чалавеку заўсёды патрэбна паэзія, што замяніць яе нічым немагчыма. Але паэзія пішацца толькі чыстым сэрцам. Ён высмейвае тых паэтаў, якія хочуць «ілбом прабіць вароты ў рай», «украдзеным пяром» падпісваюць «незабяспечаны вэксаль».

Не, паэт Іван Скала не стаў спажыўцом, не прадаў Музы за сытае жыццё. Ён заўсёды, нават у самыя неспрыяльныя для творчасці хвіліны, знаходзіць спосаб выказаць набалелае, заўсёды з народам, служыў і служыць яму сваёй шматколернай, як вясёлка, паэзіяй.

*Хведар Жычка*

# З ПЕРШЫХ КНІГ

*1939—1957*

## Юнацкая песня

Крочыш мостам ты з усмешкай,
крочыш мостам са слязамі,
крочыш мостам і мне сэрца
кожным крокам прабіваеш.

За табой бягу я следам
у паношаным каптане
тайнага майго кахання.
За табой бягу я следам,
ты — пурпурная.

Толькі чайкі,
папрашайкі,
у вачах тваіх плывуць,
крошкі поглядаў клююць.

За табой бягу я следам,
нібы паж за каралевай,
шлейф нясу — твой цень.

Але ты...
Крочыш мостам ты з усмешкай,
крочыш мостам са слязамі,
і усмешка — шчыт ахейскі,
слёзы — гэткі ж шчыт ахейскі,
крочыш мостам і мне сэрца
кожным крокам прабіваеш.

## Вясновы матыў

Дрозд на галінку зноў
усеўся і спявае.
Струменіць, нібы кроў,
песенька жывая.

Дрозд зноў сустрэў вясну,
спявае. Не да суму!
Паветра я ўдыхнуў —
прыродную парфуму.

Мароз шчэ можа цісхануць,
скаваць ручай імклівы.
А дрозд назло ўсяму
вядзе свае матывы,—

спявае адраджэнню гімн.
І я набраўся сілы,
вясну вітаю разам з ім
голасам асіплым.

## Пазнанні

Ад вясны і да зімы
стронгі ў ручаі гуляюць,
барвамі вясёлкі ззяюць,
летуценныя, як мы.

Ці то сонца, а ці дождж,
у малінавыя далі
коцяцца са звонам хвалі.
Ці то сонца, а ці дождж.

А на беразе — спакой,
бераг не імкне да вусця...
Твой пагляд і слодыч вуснаў —
вось надзейны бераг мой.

Як гады на колцах дрэў,
адкладаюцца ў маршчынах
ласкавасць, сардэчнасць, шчырасць —
гэта й ёсць кахання спеў.

Рознае ў жыцці было:
праясненні і нягоды.
Мы стараліся заўсёды
сэрцам сэрцу даць цяпло.

З дня вясны ды ў летні дзень
прыплылі, п'ём мёд і сокі.
Нас на сена з траў высокіх
восень мякка пакладзе.

Як гады на колцах дрэў,
адкладаюцца ў маршчынах
ласкавасць, сардэчнасць, шчырасць —
гэта й ёсць кахання спеў.

# Просьба

Ходзіш па лесе, шукаеш
сястрычку-крынічку
з халодным струменнем жывым.
Да вуснаў каменны збан падымаеш,
поўны вады жалезнай,
да дна не дапітай нікім.

Тая вада на зубах звініць,
Зубы заходзяцца, сэрца трымціць.
Не вер мне, не вер,
я не жалезны, але з агню,
не вер мне, не вер.

Як тая пралеска на маставой —
каханне маё.
Як сонечны зайчык на цэгле сырой,
як стаў, над якім не кружыцца птах,
як рэдкая скрыпка
ў нязграбных руках.

Калі б каханне не было бядой,
яно не было б каханнем.
Як тая пралеска на маставой —
маё ты каханне.

Напіўся з патоку майго агню,
але не вер мне, не вер.
Я не жалезны, але з агню,
не вер мне, не вер.

## Развітанне

*Юліусу Фучыку*

Не звыклі мы словамі ліпкімі,
вершамі горкімі, хліпкімі
развітвацца толькі ўсхліпамі:
праводзілі мёртвых тырадамі ў рай
з цвёрдым канчаткам — бывай!

Але сёння сама зямля
не можа ўспомніць,
дзе яго пахавалі.

Верацяно веры нітак напралі
на калаўроце адвагі,
помсты святая прага —
зоркай на сцягу.

З астрога насланні —
лісцікі з дрэва пазнання,
выносілі тайна
магутны кулак слова.
Дрыжыце, панове!

Час расчэсваў
валасы эшафотаў
грабянцом жалю,
аж ярасць трашчала,
сціскала нас,
кусала,
наскрозь працінала.

Трапяткая лістота
бляднела ў крыві,
збітая, маўчала...
Знішчылі цела,
Толькі цела не стала!
А сам ён жывы,
неўміручы.
сэрца яго, нібы птах,
перад крывавымі ценямі
у вёснах, як дрот калючых,
б'ецца ў эпохі грудзях.

*Са зборніка*

## «РАНІШНІ ПОЕЗД НАДЗЕІ»

*1958*

# Дворык

Ля аднаго дома,
на задворках,
паміж бляшанкамі для попелу
расце шоўкавая светла-зялёная трава.
Расцвітаюць і адцвітаюць над ёю два глогі,
увесь дзень па ёй бегаюць дзіцячыя ногі,
на яе асядаюць і попел, і сажа,
і яна ўсё трывае, нічога не кажа.

Для нас той закутак стаў родны і блізкі.
Мы з вёскі прывезлі ў горад вялікі
багацце бядоты — свае мары, надзеі
на лепшую долю, на бацькаў заробак,
што тут адкаснецца ад мамы хвароба...
Бач, траўка-мураўка як зелянее!

За дворыкам дзесь цыркавы балаган быў.
Рэклама крычала агнямі, сцягамі,
пагоншчыкі ляскалі бізунамі,
і коні ляцелі праз вогненную феерыю
у нашыя сны і ў далёкую дзікую прэрыю.

Кожную ноч у неонавым святле рэкламы
касматыя коні
гібкімі шыямі ў ласо лезлі самі,
напятыя ветразі плылі ў змрок туманны,
крыллем біліся ў парусіну бакланы.

Ля аднаго дома
у самым двары

кенар спявае ад зары да зары,
і хлапчанё з вачамі, як мора, зялёнымі
слухае птушку душою ў песню ўлюбёнаю.

Гэта — я,
а птушачка — песня мая.
песня мая і дзяцінства маё
ў дробную клетку, як за кратамі неба.
Хлопчык той — я,
на птушачку дзівіцца ўмольна
і верыць той песні, таму што дзіцяці
верыць у штосьці трэба.

А палове сёмай гадзіны раніцы
заходзіць мама ў пакой,
зоркі міргаюць мне на развітанне,
ноч датрашчыць у кавамолцы ручной.
Пачынаецца яшчэ адзін дзень
няспраўджаных сноў і надзей.

Яшчэ адзін дзень бацька марна шукае работы.
Яшчэ адзін дзень мінае,
хаваюцца цені за плотам,
яшчэ адзін дзень прастаяў жабраком ля варот,
яшчэ адзін дзень, як шарык надзьмуты,
упаў на калючы дрот.

На тым прадмесцкім дворыку,
між іржавым жалезам, кветкамі рамонку,
між смецця,
на дворыку, сонцам сагрэтым,
я спазнаў усё, што дазволена дзецям,
усё, чаго не ведаў дагэтуль.

У памыйным вядры выносілі з дому надзеі,
праз дзіркі тыдняў, як попел,

рассыпалася дзяцінства.
Было яно — і няма, згарэла...
І матулю павезлі адтуль назаўсёды.
Кенар спяваў у той дзень,
нібыта хацеў разбудзіць усю прыроду.
і ўсё пачалося інакшае.

Таптали мяне, гнулі мяне
жалезнымі рукамі.
Пастом мяне мучылі, нянавісці вучылі,
у сэрцы слабінку шукалі
і воўка
з ліпавага дрэва маёй душы
выразаць хацелі.

Але траўка расла
на дворыку майго сэрца
ад злых людзей схавана,
і птушачка спявала, спявала
усхвалявана.

Той куточак мне ніхто не дарыў,
ніхто і не адыме,
Чуеш, траўка-мураўка, і ты, жоўты птах,
я вас зноўку знайшоў,
заплацію за вас належнае —
свой залаты меч, сваё маленства,
гэтыя акрываўленыя цацкі.

Той куточак мне ніхто не дарыў,
ніхто і не адыме,
і хоць было там не лепш,
чым у падпаленым стозе,
ведаю я, ведаю, што вярнуся туды
па птушынае малако,
па лісцік трыпутніку,

па сінічку,
па ножык-сцізорык,
па ціхае слова,
і ўсё гэта зноў знайду на ўлонні тваім,
мой любы прадмесцкі дворык!

# Доўгі
# вясновы дзень

Твае валасы пахнуць
вясновай травой.
Ад ранку нясеш аблокі
над светлай сваёй галавой.

Ноч аж на дно нырнула
і вынесе з глыбінь
вусны твае адкрытыя —
мой рубін.

Цяжарная вулканам
гара — маўклівы гмах.
Верш плыве дукатам
у рыбіных зубах.

## Незакончаны верш

Хто з бляскам чыстых вачэй дзіцячых
у захапленні на свет глядзіць,
марскія хвалі ў крыніцы бачыць,
куды авечкі прыходзяць піць;

хто, ўзяўшы молат, адчуе ў ручцы
жывой бярозы цяпло і звонь,
хто ў поўны формул сухіх падручнік
кладзе фіялкі блакіт-агонь;

хто ў цэх прыносіць вясновай песні
пяшчоту-шэпт і грому медзь,
хто тройчы з попелу ўваскрэсне,
як птушка фенікс, каб зноў гарэць;

каго каханне з ружовай цішы
іржышчам гоніць у вечны бой,—
няхай вось гэты мой верш дапіша,
бо й верш задумаў я з ім і з ёй.

## Жаданне

Каму яшчэ ніколі не хацелася
узяць за повад двух каней гнядых
і весьці да начной ракі, там зоры піць
ды слухаць плынь бясконцую вады?

Каму яшчэ ніколі не хацелася
ноч, нібы міску, патрымаць пад сэрцам,
па кропельцы ў яе сплываць крывёй?

Так з ночы ў ноч цябе чакаю. За акном
гудуць маторы, над бульварам ціхім
неонавае ззянне сыпле іскры,
і промні сінія тапчу нагамі я.

І ты ўжо тут, раптоўна тут з'явілася,
з трывожным неспакоем, з гарызонтам,
які не ўмесціцца ў абрысах пустаты.

Ты — тут, і пліты бруку, бы ў дзяцінстве,
пераступаеш так: па белых крочыш,
а сінія пераступаеш. Гэта — ты!

І па стале між кніг, паперак розных
праходзіш, як ігліцу, мае вершы
ты адграбаеш босаю нагой.

Сіпіць пацiху медны казан месяца.
Ляжыш ты дагары ў траве, салодка спіш,
і зорка першая на мятліка сцяблінцы
гайдаецца ля веек ля тваіх.

Плячом трымаю над табою свет,
фрывольны, лены, закаваны ў панцыр,
квяцісты, як кірмаш, саладкаваты,
як хлараформ, пасля якога чалавек
прачнецца з ампутаванаю нагой.

Плячом трымаю над табою свет,
той свет, які цябе сваім цяжарам,
напэўна б, раздавіў, рукою з твайго неба
адводжу прэч апакаліпсічны жах.

Ты — тут, ты — дзесьці блізка,
можа, побач
у свеце гэтым зеляніны буйнай,
хлеб наразаеш, граеш на раялі,
і на тваім плячы кароўкай божай
прыгожы след — адбітак губ маіх.

Калі б ты падарыла мне хоць толькі
струменьчык дыму над Ітакай любай,
які ляціць па небе маёй мары,
я б ведаў, дзе мая Радзіма,
куды імкнуцца мне.

І захацелася мне ў гэтае імгненне
узяць за повад двух каней гнядых,
піць з імі зоры у начной рачулцы
і слухаць плынь бясконцую вады.

## Развітанне

Зялёнай лістотай вясна запяе,
сцяжынкі травой зарастуць.
Кладу пацалункі на вусны твае,
нібыта закляцце: «Забудзь!»

Няхай бы ў жальбе, катаваннях, журбе
вярнуцца на пройдзены шлях.
Калі б нават смерць прыйшла па цябе,
дык з ружай у вострых зубах.

Над намі рассыпаўся сонечны дзень
калхідскім руно залатым.
А як бы стрывала ты сёння глухмень
імжы, што наступіць затым?

Счарсцвелыя, з подыхам горкім лясным,
ты вусны мае асвяжы.
Скідаем нарэшце мы сны-туманы,
бы скуру старую вужы.

Не здолелі цэлай карціны стварыць
і песень дапець агнявых.
Магчыма, і слёзы нас будуць паліць,
хоць не жадалі мы іх.

Зялёнай лістотай вясна запяе,
сцяжынкі травой зарастуць.
Кладу пацалункі на вусны твае,
нібыта закляцце: «Забудзь!»

Сляды нашы згубяцца ў кветках лугоў,
у тлуме мяцеліц і сцюж,
ды ўзыдуць калісьці з рассыпаных слоў
праменныя парасткі руж.

## Хацеў бы быць...

Хацеў бы быць чымсьці такім,
без чаго ты не можаш абысціся,
без чаго ты не можаш нідзе і ніколі
абысціся.
Хацеў бы быць соллю,
хацеў бы быць соллю твайго жыцця.

Хацеў бы быць соллю,
што асядае на тваёй скуры
тонкімі лускавінкамі,
калі пад жнівеньскай спякотай
ты згінаешся ў полі,
мыеш бялізну, гатуеш абед
ці, стомленая хадою, прысядзеш
пад вішняй на пляскаты камень.

Хацеў бы быць слязою на тваіх вейках.
І калі ўжо не змог быць
першым тваім дзіцячым плачам,
які абмыў твае вочы
першай чалавечай жальбай,
хацеў бы быць хоць слязой,
якая ў міг шчаслівага хвалявання
збіраецца ў куточку твайго вока.

На ўсіх тваіх сцежках хацеў бы быць соллю,
што інеем кладзецца на матроскі бушлат
пасля кожнага ўсплёску хвалі,
пасля кожнага ўздыху волгкага ветру.

Хацеў бы быць тым салёным ветрам,
што табе прыносіць і пах акіяна,
і сінія далі, і салодкія сны
адусюль, дзе мы з табой не былі
і куды не заглянем ніколі,
але дзе гэтак жа, як і ў нас,
адразаюць лусту хлеба
гэткімі ж мазольнымі рукамі, як і нашы.

Хацеў бы быць крышталікам солі
на анісавым мякішы твайго надзённага хлеба.
Хацеў бы быць соллю,
каб да апошняй тваёй лусты быць з табой.
Хацеў бы быць соллю твайго жыцця.

# Гэтай парой

Гэтай парой, калі людзі зачыняюць вокны
свайго шчасця, свайго няшчасця,
парой, калі зачыняюць усе вокны,
каб пры сабе ўтрымаць нянавісць
і мары,
гэтай начной парой
я свету, які наплывае адусюль
з крылатай сілай арлоў,
з малочным водарам немаўлят,
са шрамамі ад сякеры, сонечнымі пёркамі,
свету, які наплывае адусюль,
акно сваёй душы адчыняю.

І ты, любая,— таксама мой свет,
неспакойны, вясновы, пульсуючы свет.
І таксама прыплываеш у маю душу.

Я люблю твой дзіцячы мірны тварык,
да якога не стасуюцца ні маршчыны,
ні цень нагаек, што і сёння падаюць
на голыя спіны дзяўчат Касабланкі.

Люблю цябе ў гэтым складаным,
неспакойным свеце,
як вецер любіць клычыць
верхавіны елак,
як сонечнае святло любіць размалёўваць
прыроду
усімі сваімі барвамі.

Калі б ты была агнём, ведаю і веру я,—
ты спаліла б сама сябе,
каб прынесці надзею
тым, хто блукае.

Калі б ты была ракой,
прынесла б мне сінія камяні з гор,
і рыбіным бляскам маланак
сваіх гарачых вачэй
зняла б з мяне
частку майго маўчання.
калі б ты была ракой.

Ты — мой хлеб
і салодкі аніс,
растворанны ў маім хлебе.
І я цябе кахаю,
кахаю і мілую ў гэтым складаным
і неспакойным свеце.

І гэтай парой,
гэтай начной парой,
сваё сэрца,
напоўненае святлом шчасця
і святлом няшчасця,
сваё сэрца, якое маўчаць не ўмее,
прывяжу да ствалоў грубых вершаў
і на пароме песні сваёй
пушчу ўслед за табой па плыні.

## Сталінград а чацвёртай гадзіне раніцы

І зноў быў ранак... Зорныя пагоны
сарвала ноч і — без нашывак, знакаў
адрознення, пустая, адстаўная —
у стэп далёкі бегла, аж за Волгу,
што ўзнесла крылы верша да легенд.

Свет, што зіхцеў, як вымыты газон,
узнёс свае шчаслівыя суквецці
якраз на гэтай вузенькай зямлі.
Ды час не спаў, хоць і ў магіле —
падспудны гул блукаў пад ачагамі,
матыў падспудны біўся пад каменнем,
маю журбу ён клікаў на прастор...
Непадалёк, дзе ўзводзілі плаціну,
крыху наўскос да хуткай плыні рэчкі
тырчалі жорстка выпнутыя плечы
землечарпалак, грукнуў каля студні
цабэрак — нібыта паілі
у нашай вёсцы коней, як даўней.
Над берагамі волжскімі ўжо днела.

Жывыя рытмы ўспыхвалі. На кухнях
дымілася зноў водарная кава —
перад спакойным працавітым днём.

І мы ступілі на шматок зямлі,
дзе, нібы з хваляў, выныраюць ноччу
людскія рукі з тысячаў магіл.
Цяпер тут юны горад падымаўся.

Я памятаю кожную драбніцу —
расу на вогненных цюльпанах, цені
акацый, мокрых, як пасля купання,
дамоў вясёлыя фасады, сонца
на занавесках; ранішніх прахожых
і песеньку, што мне прыносіў ветрык.
І ўсё ж — не знаю горада, каб быў ён
старэйшы, чымся гэты, каб вось так
быцця асновы агаляў хто шчыра:
упартай Троі каменныя глыбы
сабе пад ногі ён паклаў, памазаў
слязамі ўдоў і матак Карфагена,
змяшаных з попелам калісьці зруйнаваных
усіх на свеце гарадоў і вёсак.
І леглі камяні ў яго падмурак,
з якіх і час не саскрабе ніколі
пот прадсмяротны, цэлых армій кроў.

Якраз світала. Адлятала ноч.
Гнаіліся ў зямлі жалезныя асколкі,
здавалася, не вымыюць дажджы
іржаўчыны густой крыві пралітай,
на плашч-палатках засцежак бляшаных
і гільзаў адстраляных — цёмная латунь
галосіць, як трамбон, які ўжо ты
не паднясеш да вуснаў. І як смерць,
гудзеў цімкан высокіх дэтанацый,—
вялізны, ад усходу да заходу — ўсюды,
дзе грукала смяротная навала.
Ноч набывала контуры дывізій.

Карычневымі горламі зіхцела
нянавісць тут. Армады танкаў
у Сталінград ірваліся, да Волгі,
і ў гусеніцы іх сваю гаркоту
ўліваў палын. І плавілася глеба,

а недзе ззаду цэнтурыён шалёны
нагу паставіў на парог Валгалы,
крычаў прамову. І ў пякельным рытме
марыянетак, што зусім бяздумна
скакалі і крывёй сплывалі спакваля,
ступалі ў ботах кованых, агністых
і пранікалі ў шчылінку малую
між двух удараў сэрца... Толькі вы,
з імпэтам, што палае на малюнках
этрускаў старажытных, на шляху
жалеза ўзводзілі жалезам — у акопах,
нібы ў сваіх магілах: хто па грудзі,
а хто па горла — выграбалі іскры
надзеі з ледзяной глыбокай студні
ваеннай, волжскай, яраснай зімы.
Калі было надзейнае ў нас штосьці
у тыя дні — дык толькі ваш плацдарм,
дзе чалавек, павіснуўшы над прорвай
надзею чалавецтву ў сэрца ўліў.

І Паліфем асліплены зароў:
цімпаны дэтанацый, бомбы, бомбы —
і за руінай узарванай сценкі
хлапчук без сну, настойліва, зацята
стрыножваў яго каляны крок
аж шэсцьдзесят начэй... Я гэта знаю,
жыцця не хопіць мне, каб расказаць
аб тым, як тут змагаўся Фёдар Паўлаў.
Я тыя мёрзлыя акопы бачыў,
дзе людзі ўсім смярцям наперакор
на смерць стаялі на вякі без змены.

Світанак запазняўся. І руіны,
што горадам былі калісьці, густа
дым чорны абвалок, як звер крывавы.
І Паліфем са свастыкай на бляхах

з ваўчыным воем уцячы імкнуўся,
назад палкі каціліся з абозам,
са страхам у вачах і без надзеі,—
бо тая ноч была мяжой, пачаткам
агоніі, канца і небыцця.

Я гэта бачыў з берага насупраць
у час світальны. Бачыў Сталінград —
і ведаю, чаму сустрэліся тут мне
мужчыны, што старэйшыя за горы,
дзяўчаты, што аддалі прыгажосць
сваю за прыгажосць жанчын і нашых,
і юнакі, што на худых плячах
старэчы свет наш вынеслі з той бойні,
узяўшы на свой твар зямлі маршчыны.

Усім жыццём я звязаны з імгненнем,
калі, схіліўшы галаву, стаяў
над вашымі магіламі святымі. Да жывых
вы, мёртвыя, крыламі прыраслі.
І за галовамі за вашымі зноў бачу
я тую пядзь зямлі, што непарушнай кропкай,
надзейнаю апорай Архімеда
абралі вы, каб павярнуць зямлю,
нібы пясчынку. У жыцці бывае,
калі мы моўчкі заплаціць павінны
за ўсё, чым вінаваты, што ў пакутах
не выплавілі шчэ дачыста з сэрца.
(Тады мы кажам, што ляцеў над намі
анёл-ахоўнік.) Гэтак жа і я
стаяў тут моўчкі і пабочных думак
драбнюткіх у душу стараўся не пускаць.
А свет зіхцеў, як вымыты газон,
узнёс свае шчаслівыя суквецці
якраз на гэтай вузенькай зямлі.

Над берагамі волжскімі світала.
І я запомніў кожную драбніцу —
расу на вогненных цюльпанах, цені
акацый, мокрых, як пасля купання,
дамоў вясёлыя фасады, сонца
на занавесках; ранішніх прахожых
і песеньку, што вецер мне прыносіў,
і камяні тых плошчаў, з якіх час
не саскрабе крыві ўжо аніколі.

Якраз світала. Адстаўная ноч
без імя і без славы уцякала
туды, куды аджыўшае спяшае:
на захад... І назад адсоўвалася ноч.

Напэўна, гэта шчасце — раптам бачыць
на беразе світанку: ноч растала
і каціцца назад, у небыццё.

Я гэта бачыў, я запомніў гэта.
Чацвёртая гадзіна. Свет цудоўны
перад наступным сінім, доўгім днём.

*Са зборніка*

## «ВІТАЮ ВАС, ВОКНЫ!»

*1962*

## Вітаю вас, вокны!

Вітаю песняю вас, вокны!
Пасля нязрушнасці начной
вы свет прыгожы і пяшчотны
прыносіце мне раніцой.

Сярод паперак не зачахнуў,
у грамадзе яшчэ не знік
і сам сябе шукаць па частках
у вашых люстрах я не звык.

Больш не чаргуюцца ў змаганні
дні згоды з днямі барыкад...
А году год дыктуе планы,
рахунак поспехаў і страт.

Святлом кватэры ўсе заліты.
Ды чую: хтосьці хоча зноў
азмрочыць дзень наш працавіты
атрутным чадам гучных слоў.

Туга былая грудзі поўніць,
і хочацца сяброў гукаць,
і зноў на сэрцы неспакойна...
А вокны — вокны аж гараць!

За ноччу дзень бяжыць без стомы...
Я — раб сваіх жаданняў, дум —
свет невядомы і вядомы
бясконца адкрываць іду.

# Што ўбачыў жнівень у тваіх вачах

*Веры*

Вочы твае залатыя — як з мёдам пчаліныя соты,
вочы твае залатыя — ясны святочны дзень.
У сэрцы тваім, поўным дабра і пяшчоты,
нітку маёй планіды лета прадзе.

Ты — і маё жаданне,
ты — і мая журбота,
ты — і маё выгнанне,
ты — і мой родны дом,
ты — і мароз калядны, і спасаўская спякота,
ціша першых сняжынак і гучны звон пад вадой;
ты — схіл залатога ўзгорка,
сагрэтага небам бясхмарным,
ты — каля брамы раю разлогі ружовы куст,
ты — паляўнічы адважны,
ты — і пужлівая сарна,
калодзеж невычарпальны шчасця майго і пакут.

Вочы твае залатыя — як з мёдам пчаліныя соты,
вочы твае залатыя — ясны святочны дзень.
У сэрцы тваім, поўным дабра і пяшчоты,
нітку маёй планіды лета прадзе.

# Ода

Слаўлю ранак, што тчэ залацістыя ўзоры
на зялёным кіліме зямлі маладой.
Слаўлю ранак,
што выбег дзіцёнкам на ўзгорак,
іскры кветак рассыпаў ружовай рукой.
Слаўлю ранак — пачатак працоўнага будня,
звон пілы і кавальскага молата стук.
Слаўлю вёдры,
што чэрпаюць свежасць са студні ,
слаўлю прагную ўвішнасць мазолістых рук.
Слаўлю пошум лясоў.
Слаўлю нівы і пожні.
Слаўлю мудрую ўпартасць няскораных рэк.
Слаўлю рост гарадоў.
Слаўлю вёсак заможнасць
і цябе, вечна юны тварэц-чалавек!
Слаўлю моладзь — надзею і веру народа,
пракладаць у нязнаныя далі ёй след,
адкрываць таямніцы кладоўкі-прыроды,
караваны ракет несці ў зорны Сусвет.
Слаўлю просценькі ранак,
што сціплы наш дворык
асвятліў, каб прачнулася дружна радня.
Слаўлю ранак,
што выбег дзіцёнкам на ўзгорак,
ранак нашага веку,
і года,
і дня.

## На дружбу

Буду табе я горкім сябрам,
вось табе мая рука.
Буду табе я горкім сябрам.

Голадна табе? Холадна табе?
Дам табе хлеба, налаўлю рыбы, запалю ў печы,
прыпасу дроў на ўсю зіму.
Дам табе паспытаць і голаду і надзеі.
Буду табе я горкім сябрам.

Патрэбен табе груган для перасцярогі?
Патрэбна табе варажбітка-зязюля?
Буду для цябе груганом і зязюляй.
Буду табе я горкім сябрам.

Дам табе хлеба, налаўлю рыбы.
А спатрэбіцца — рызыкуючы жыццём,
вынесу цябе з трухлявага дома дастатку,
каб зберагчы тваё чалавечае сэрца.
Буду табе я горкім сябрам.

Магчыма, ты падымешся
аж пад самую вяршыню славы —
даганю там цябе, прывяжу табе камень да ног,
адшукаю ў табе тысячу хібаў,
вырву з твайго сэрца ўсе ўшанаванні,
усе словы пахвалы,
каб ты адчуў сябе толькі на пачатку дарогі,
на пачатку вялікай і цяжкай справы.
Буду табе я горкім сябрам.

Магчыма, знясілееш ты ў дарозе,
я тайком паменшаю твой цяжар,
але спагады маёй ты не пачуеш,
наадварот, пасмяюся я з твайго бяссілля.
Буду табе я горкім сябрам.

Магчыма, адчуеш калі самоту,
прыйду я да цябе, прыхаплю жменьку тытуню,
падбадзёру цябе я добрым словам.
Буду табе я горкім сябрам.

# Спроба намаляваць партрэт

Ён ведаць не ведае, што ёсць ураганы,
ніводнай чалавечай слязы не высушыў,
ніколі не гарэў яго твар
у распаленай лагчынцы
між двума грудочкамі жаночых грудзей.

На вешалку павесіў свой гнеў,
на вешалку павесіў свой смутак
і перад людзьмі паўстае круглы і бліскучы,
напамаджаны святлом.

Ён мае дома трое хадуляў рознай вышыні.
Да кожнага гарнітура —
не меньш трох твараў:
адзін — прахадны,
адзін — паказны
і адзін — на якім плаваюць мёртвыя вочы.

Залатым пазногцем вечнага пяра
капаецца ў нашых
людскіх справах.

Наводшыбе расце дрэва.
У майстэрні пупышак ствараецца лісце,
лісце шуміць, гудуць у ім пчолы,
спяваюць птушкі,
пра цікавую і прыгожую будучыню лесу.
Наводшыбе расце дрэва.
І ён падлічвае душы таго дрэва.

І як ён умее глядзець на свет
сваім велічным паглядам
з вышыні сваёй службовай вежы!

Свет дзікі і ўпарты,
свет зменлівы, тлусты, пахкі і забаўны,
свет букалістычны,
свет катастрафічны
падстаўляе яму хрыбет, каб пагладзіў.

На грудзі яму ўсю ноч схіляюцца турботы:
ці заўважылі яго там, на гары,
ці дастаткова ён быў пакорны ў пакоры,
ці не сказаў чаго лішняга на двары.

На грудзі яму ўсю ноч навальваюцца турботы:
чаму людзі сталі такія разумныя,
чаго людзі ўсміхаюцца,
чаму людзі здаровыя, як рэдзька...

Ён ведаць не ведае, што ёсць ураганы,
ніводнай чалавечай слязы не высушыў,
ніколі не трымаў у руках распаленага жалеза.

Кожную думку,
вялікую, небяспечную і гладкую,
пасыпле попелам,
каб не пакаўзнуцца.
Залатым пазногцем вечнага пяра
капаецца ў нашых гарачых жыццёвых
чалавечых справах.

*Са зборніка*

## «ВЯСТУН ПРЫХОДЗІЦЬ ПЕША»

*1968*

## Восень

Як хтосьці ляснуў пугай —
усё скошана, складзена ў стагі,
а нідзе ні травінкі.

Куды дзеўся той неспакой, тое падабенства ветру?
Куды адплылі тыя хвалі,
што адклейваліся ад пясочнага
берага і беглі аж за небасхіл?

Як хтосьці ляснуў пугай —
знікла вада са студні,
замест паверхні,
якая адлюстроўвала зоркі,
убачыш камень на дне,
які адлюстроўвае камень.

На скронях сівое бадылле
просіць брытвы.
На вуснах верасня
шчасця самкнутых вуснаў.

Усё складзена ў стагі
і спешна звезена.

Убачыш толькі такое:
дагараюць з дымам
рыжыя агеньчыкі.

Пачуеш толькі такое:
працяжным піскам
мышы-палёўкі выціраюць боты.
Загалёкала сухапарая крапіва,—
вось у яе нічога не адбылося,
нічога не збылося.

Восень шчыра расказвае:
каму наступілі на нагу,
каму загналі стрэмку пад ногаць,
чыё выпілі возера,
каго назвалі па імені,
каго не назвалі па імені,
каго надзея прайграла ў карты.

Цяпер гэта відаць.

Чартапалох апранае вераснёвую карону.

Хутка навокал
пойдуць сумныя дажджы.

# Сон, якi вяртаецца да мяне з канца вайны

Увесь час не дае мне спакою.
Прысылае мне адтуль паштоўкі,
кожную ноч аднолькава —
з той страшнай магілы.

Зноў у скляпенні сядзім.
Хтосьці ўжо — у мышынай скуры трымцення,
а навокал толькі вочы,
вялікія, адкрытыя, здзіўленыя
дзіцячыя вочы.
Неба клякоча
дзесьці над галавой.

Пасля кожнага выбуху
нешта ў вачах прападае.
Пасля кожнага выбуху
нешта з сцяны ападае —
атынкоўка, цэгла, абломкі,
пакуль цагляная груда ўсё не пахавала.

Груда абломкаў — і ўсё,
груда, з якой мёртва крычаць
ножкі ў танных панчошках.

Груда бязмоўная — і ўсё.
Толькі адзіны аконны праём
з вострых абломкаў мяне выдзірае.
Рукі ўжо на волі,
галава і плечы,

але далей не магу,
ні ўгору,
ні ўніз —
так і завіс.

Так і вішу ўвесь час
у тым акенцы падвальным
колькі гадоў:
палавінай цела вольны,
палавінай цела пахаваны.
ад страху крычу.

Крыкам хапаючы за ногі абыякавых.

# Партызанскае

Калісьці ўсё гэта засыплецца лісцем
знявагі, славы, пахвал і праклёнаў
і гэтаксама ж будуць аплачаны
фальшывыя вэксалі.

Калісьці ўсё гэта засыплецца лісцем,
але цяпер
між явараў ходзіць восень
паважна, як той мельнік,
і да першых сняжынак
чуюцца адзіночныя выстралы.

Па адхонах бадзяецца восень
і ўсё пытае:
«Хто табе падаруе гэтую зіму,
хто з цябе выцісне
яшчэ дванаццаць гадзін маршу
праз завіруху,
хто цябе вызваліць з акружэння,
хто пакладзе табе ў падсумак некалькі
патронаў,
хто табе замёрзлымі
адубелымі пальцамі
скруціць казіную ножку?»

Ты ведаеш адно:
не ўсё яшчэ прапала,
і не будзеш са страхам хапацца
за выратавальны падол.

Калісьці ўсё гэта засыплецца лісцем,
але цяпер
вясна б'е абухом па лёдзе
і ўсё пытае:

«Хто не схаваўся ў нару, як барсук,
калі прымярзаюць пальцы да курка,
хто з табой наспех еў з міскі
халодную прасяную кашу,
хто пакідаў на снезе
арыядніну нітку крывавых слядоў,
калі на гарызонце палалі
вёска за вёскай?»

Ты гэта ведаеш,
безыменны, як прах з фермапільскай цясніны.
Ты гэта ведаеш
і маўчыш,
як мудрасць,
як стэла, надпіс на якой
загаворыць праз тысячу гадоў.

Калісьці ўсё гэта акрые ліст вясновы,
у той дзень будуць развявацца сцягі
і жывая сталь разальецца на медалі,
якія гучна раскажуць
пра тваё замёрзлае зацятае маўчанне.

4. Зак. 725.

# Украдзеным пяром

Не, там ужо ідзе гаворка не пра жыццё,
арошанае шчаслівымі кроплямі поту,
гаворка не пра бліскучае насенне будучыні,
не пра вартасці чалавека з ліку тых,
што ўсюды растуць някідка і прытым ціха.

Гаворка ідзе пра словы, нагрувашчванне слоў
(кажуць,
вось так конь Аляксандра Македонскага
убраннем перасягаў самога палкаводца),
гаворка толькі пра словы,
закураныя агнямі рампы,
пра словы, якія з упартасцю крата
точаць глебу, на якой спее твая надзея,
на якой ставіш свой дом.

Гаворка там ідзе толькі пра словы,
вакол якіх высыхаюць парваныя карэньчыкі,
пра словы, якія і марам надаюць падобу
сцяны абледзянелай пячоры Платона.

Гаворка ідзе толькі пра словы, пляцёнкі слоў,
па якіх карабкаюцца златавустыя прэтэндэнты,
між тым як філосаф,
што бенгальскім агнём асвятляе ім прыступкі,
закасаўшы рукавы і з крывой усмешкай
у соты раз падпісвае незабяспечаны вэксаль,
да таго ж яшчэ — украдзеным пяром,
вырваным з таго ці іншага археаптэрыкса.

## Калі пішаш

Калі пішаш,
нібыта глытаеш нажы.

Першы глыток —
гладкай рэззю нож пранікае ў страваvод.

Другі глыток —
нож асцярожна праходзіць
каля самага сэрца.

Трэці глыток —
нож прабівае клубок змей
і прыбівае цябе назаўжды
да распаленай скалы
Каўказа.

# Кароткі курс лятання

Вазьміце
добра выважанае крыло
памерлага, але не зусім астылага, анёла,
змажце яго мёдам,
каб не церлася аб паветра.
Далей:
акуратна размалюйце чужымі грахамі
вялікую браму храма,—
вось і другое крыло гатова.
Далей:
адшукайце высокае, адусюль віднае, месца.
Спачатку паназірайце
за слупамі дыму
над кацельнымі чужых лёсаў,
каб ведаць сілу і напрамак ветру.
Далей:
акрэсліце вачыма гэтае паветранае дрэва,
нібы візіянер, але не занадта сур'ёзна.
Аздобце грудзі ўдала падабранымі сцяжкамі,
яны добра ўлоўліваюць вецер
і ўзносяцца ў паветра.
Потым:
уважліва сачыце за слупам тарнада,
куды ён закручваецца — направа ці налева,
ці вялікая ў яго пад'ёмная сіла
(але каб не была катастрафічная),
ці падыме яна вас
з усімі вашымі камянямі ў нырках,
журбою, нявер'ем, чорнай агатавай здрадай.

Потым:
зрабіце некалькі глыбокіх уздыхаў.
Потым:
з наіўнай пакорай,
падобнай экстазу,
пад дакладна вылічаным вуглом
шырока разапніце крылы
і ўзмахніце імі.

# Вястун прыходзіць
# пеша

Яшчэ мае заплятаюцца ногі
пасля доўгай хваробы.

Каб хоць чаго не забыцца!

Старанна выбіраю
яйцо
з варонінага гнязда праўды.
І выпіваю сырое.

Усё гэта паўтараецца соты раз —
печаныя скваркі Троі.
Па свеце цячэ кроў,
і корпіяй слоў
яе не спыніш.

Усё гэта паўтараецца
соты раз:
з каляровых стужак
сплятаем зашмарг на нейкую істоту,
ды ўсякі раз трапляем
уласнай шыяй.

Усё гэта паўтараецца
соты раз:
толькі яно аперыцца
і зноў нас хвалюе.

Здымаю парадную форму.
Без плюмажа

з адной ільняной нашыўкай
радавога.
Толькі на адлегласці
уласнай рукі.

За пятку трымаю верш
над глыбіняй Стыкса.
Як Ахілеса, буду яго карміць
мядзведжымі мазгамі.

За пятку трымаю верш.
У жалезныя воды
яго пагружаю.

# Летапіс

Вось так, подбегам
імкнуцца ў гісторыю
праз кімсьці наспех пастаўлены мосцік
з нейкім калосам, амаль радоскім,
з нейкім нечуваным дагэтуль выразам,
перад якім у тысячагоддзяў
падломваюцца ногі.

Тацыты гуляюць уперагонкі.

Але гісторыя, як горны паток у цясніне,
рушыць валуны, суне гальку, абточвае камяні,
падмывае парогі,
аблівае ўцёсы халоднымі ліўнямі,
якія маюць недаацэненую сілу
асобных дажджавых кропелек —
зліваецца ў бурныя рэчкі.
І ўсё гэта імчыцца наперад.

І як сказаў Гамер пяхоты — Бертальт Брэхт,
для пераможных армій славутых палкаводцаў
патрэбны ананімныя кухары,
а на сцяне кафедральнага сабора
імёнаў муляраў не пішуць.

Яны ж не спяшаюцца да сціплай кухоннай пліты,
хоць свет і галадае,
але зоймуць дзве старонкі Тацыта,
нейкай нечуванай ідэяй.

І ўзважваюць у руцэ не цагліну, а бізун,
што лоўка кладзецца на спіну таго,
хто, нібы скульптура багіні Правасуддзя,
усляпую ўзважвае кожнае сваё слова
у правай і левай руцэ пачаргова.

## Год за годам

Падае ртутны слупок нашых адносін.
На ўласным пульсе трымаеш руку.
Год за годам, як горкія лекі,
набракае памяць.

Выграбаеш рукамі клавіятуру,
нібы кошык з пілавіннем,
каб вылавіць адтуль
акрываўленую галаву прыгажосці.

Старанна сціраеш кроў.
І раптам заўважаеш,
што на цябе глядзіць
каварнае вока Медузы.

І зноўку запальванне стыхіі
словамі.
Зноўку навобмацак пошук
сярэбранай жылкі.

Раптам, асеплены вясенні́м святлом,
зняверышся, як той халдзейскі прарок:
а што ты ўжо тут прачытаеш?..

## Яшчарка ў траве

Яшчарка ў траве, птушка ў сіняве —
і трава жыве, і блакіт плыве.

Нам бы жыць вось так — проста, але ўсмак,
для сябе спяваць, не чакаць падзяк.

а з пласцінкі дум абзавецца сум —
дыяментам слёз змыць яго, як тлум.

Слухаць шум сасны, тайна верыць ў сны,
каб цяжар душы палягчэў з вясны.

Лета настае, шмат чаго дае,
шчэ яно тваё, покуль сіл стае.

Ціха ўбок цябе восень адграбе,
як саломы жмут, абміне цябе.

Абміне — і што ж, гэта не бяда,
яшчаркі шкада, птушанят шкада.

А пакуль плыве сонца ў сіняве,
яшчарка жыве і трава жыве!

# Хто

Хто цябе мучыў?
Хто цябе мучыў,
спрабаваў зазірнуць у душу?
Хто ўзламаў твой небасхіл?
Хто заіканне тваё задушыў?
Хто прадоўжыў тваю
цішыні агучаную пячору?
Хто папярэдзіў кожнае тваё слова
бясконцым доўгім уздыхам,
забывае на мёрзлым снезе
твайго партрэта
фіялкі?
Не зусім больш, чым адну
у кожны астуджаны
і ад босай нагі крывавы след.

## Ламікамень

Пад сапфіравай іголкай верціцца
бясконцая пласцінка будняў.

Праседжаныя зэдлікі,
праседжаная мудрасць,
праседжаныя ісціны.

Калі ж пратанцуеш першы чаравік,
калі абступяць глухія сцены,
ты пішаш на іх усе свае жаданні.

Сляпы, як бязвокая статуя,
спутаны па нагах пяшчотай,
пасаджаны непрыязнасцю
ў сядло,
пахаваны апладысментамі
і уваскрэшаны слязамі.

І ўсё ж
за крок ад цябе
скрозь брук прабіваецца
ламікамень.
Сцяблінка сяброўскай рукі
па водах Ахерона
прыплывае.

І ўсё ж
нямала ёсць іх — душ,
глыбейшых за магілы мікенскія!

І ўсё ж
радасць
бліскае і над вогнішчам безнадзеі!

Веру ў гэта,
і верай сваёй прабівацца буду
нават праз вечка труны.

## Асенні вечар

Вечар асенні
зямлю накрывае знянацку
гусіным крылом.
Вечар асенні...
І зноў нас запал юнацкі
узяў у палон.

Зноў твае мокрыя косы
сушу я ў гарачых далонях,
іх водар пшанічны
маю галаву зноў п'яніць,
каб потым,
як пойдзеш і зробішся марай далёкай,
было мне чым дыхаць,
было мне чым жыць.

Ёсць яшчэ ўласная песня...
Дзверы замкнуў за табой.
За вокнамі плача балесна
вецер
і хмары — гурмой.

Ёсць яшчэ ўласная песня...
Стаю ля акна.
Ветру свіст.
На голай галінцы трапеча
апошні кляновы ліст.

# Парастак

Падумалася: за кароткі век,
адведзены табе,
паспееш стаць спадкаемцам
мінулага, бязмежнага, як вечнасць.
Усё жыццё грузіш
каменныя ісціны на паром вады,
цяжкою сякерай слова
б'еш аб пусты пень.
Першынец у жыцці,
стаў ты адначасова
апошнім у родзе.
Сякуць дрэва,
на якім тваё юнацтва
выразала слова «кахаю».
Даўно дабудавалі сцяну,
на якой іржавым цвіком
калісьці напішаш запавет.
Падумалася: на краі поля
з'явіўся адзін парастак —
і абжыта ўся будучыня.

*Са зборніка*

# «ШТО БЯРУ Ў ДАРОГУ»

*1975*

5. Зак. 725.

# Сіні надвячорак

Перад акном, дзе я завіхаюся з гэблікам,
як званочак, берасцянка спявае,
па бочцы бегае, вочкам на мяне страляе
і п'е, баючыся мяне не вельмі каб.

Пі, птушачка, пі, колькі табе трэба,
і я цяпер прычашчаюся таксама вадой.
У ёй — і твой вобраз, і мая смага, у ёй —
шырокі сіні купал неба,
якое так пяшчотна схілілася
над табой і над працай маёй.

## Здабыча

Звініць мядовым звонам ранне,
і ўся зямля ў ружовым ззянні.

Над галавой — пучкі прамення,
як веснавое блаславенне.

Вось так фальшывыя пейзажы
штодня мастак-рамеснік мажа.

Мы, людзі, з веку ў век вяслуем
у рэчку ўсё адну ж і тую:

загадак, тайны, дзікай веры,
парожняй, неабжытай сферы,

з'яў неспазнаных і таемных,
перакананняў і сумненняў;

маленняў сённяшняму дню:
«Забі ўчарашнюю хлусню!»

Ўсяго, што цяжка паддаецца
і што само ў рот не кладзецца,

што і ўзнясе цябе і скіне,
зацягне ўраз у павуцінне.

Мы, людзі, з веку ў век вяслуем
у рэчку ўсё адну і тую.

Чым больш звыкаешся ты з ёю,
тым больш у сэрцы неспакою.
І хоць афінская скульптура
маўчыць, як той ліхвяр пануры,

што ўсе багацці свету сніць,
ды мы ўсе верым — зазвініць,

і ў грудзі, і ў спіну грукочам,
каб мудрасці дала драбочак.

У сто гадоў быць хочаш свежым,
не прызнаеш малочнай ежы

і мецішся, як той баран,
ілбом прабіць вароты ў рай.

Але ці ў тым тваё бяссмерце?
Яно ў тваіх нашчадках — дзецях,

што будуць жыць ва ўмовах новых.
Астатняе ж — пустыя словы.

Тваё ў мядовым звоне ранне,
і ўся зямля ў ружовым ззянні.

## Ужо вясна тут...

Ужо вясною пахне тут,
нібыта ў лесе.
змяту з свайго парога бруд —
і сум, і стрэсы.

Няхай пра крэйды дэфіцыт
злы крытык піша.
Хоць на паверх свой дом, свой быт
збудуем вышай.

Ужо вясна тут, хоць няма
пралесак сініх.
Хвароба, як той снег, сама
пад сонцам гіне.

А нам жа хочацца расці
хутчэй і лепей.
Хто к мікрафону дапусціў
юнцоў аслеплых,

тых дэзерціраў, ілгуноў,
ілжэпрарокаў,
што з нашых дваццаці гадоў
не мелі ўрокаў;

хто скасабочыў пазванок
пад звон гітары,
хто страціў слых,
хто страціў зрок —
жыве без мары.

Не трэба ім для іх гульні
ўжо стог саломы,
падстаўляць ногі сваёй хлусні
чужым галовам.

Ужо вясна тут. Не маўчы
пры добрым ладзе
і на ўсе лёгкія крычы
аб кожнай здрадзе.

Чаму ты не тушыў раней,
быў верны, слынны,
і дрэва ў твар табе шпурне
ліст ананімны.

Навошта мне даеш
дурныя даручэнні?
А я задумаў верш,
пісаць каб без мучэнняў.

Вясной я й сам змагу
зямлю ўзараць нарогам,
і паднавіць страху,
і змесці бруд з парога.

## Кірмаш

Хлапчукі ў свісцёлачкі свісталі,
беглі ў цір з капейкамі ў руках,
дзе з ружжа сапраўднага стралялі
па бляшаных птушках і звярах.

Збоку я стаяў і сіратліва
на чужую радасць пазіраў,
горкую спагаду і журлівасць
у вачах матуліных чытаў.

Ведаў я, што ў мамы грошай мала,
што скупее з кожным днём яна,
адразаючы скрылёчкі сала,
бо прыйшла галодная вясна...

Ды гудзеў кірмаш, трубілі трубы...
Не сцярпеў, усхліпнуў у рукаў...
І матуля моўчкі сцяла губы,
грыўню мне дастала з кашалька.

І заззяў мне свет карцінай дзіўнай
з мноствам і ласункаў і забаў.
Я ў далоні цёпленькую грыўню,
нібы ключ у райскі сад, сціскаў.

...Час мінае. Змог я перацерці
беды і нястачы на муку.
Тая ж грыўня маміна да смерці
будзе апякаць маю руку.

## Павярнуць ключом

Куляюцца ў блакіце галубы,
неба выварочваюць нібы.

Не хочацца і мне нітрохі
пісаць і мякка, і крохка.

Не па сіле нават каралю
вывернуць навыварат зямлю.

Забубную па страсе дажджом
і засну спакойным ціхім сном.

Пастарэў я, і мая рука
цягнецца да спелага радка.

Верыцца, што можна мудрасць свету
выказаць адною фразай светлай.

Тым радком, не знойдзеным па сёння,
будзе моцны верш, як парастак зялёны.

Мне б заснуць цяпер і ў сне прыемным
адамкнуць ключом замок таемны,

як калісь, дыханне затаіць,
дзверы ў казку ледзь прыадчыніць...

# Радзіма

Дзе нарадзіўся я, няма высозных гор,
няма і мора з пырскамі прыбою,
дзе нарадзіўся я, няма высозных гор,
быў мой увесь прастор — курыны двор,
парослы палыном і лебядою.

Дзе нарадзіўся я, не пініі раслі —
шумелі над маёй калыскай сосны,
дзе нарадзіўся я, не пініі раслі —
і прыгажуні там не ружамі цвілі —
у клопатах зямных іх адгаралі вёсны.

Не бачыў я ў дзяцінстве вадзяных валоў
з баранчыкамі пеннымі на грэбені,
на пашу раніцою выганяў кароў,
а нада мной, бы статак бараноў,
плылі аблокі па блакітным небе.

Навек малюнкі тыя ў памяці збярог,
да іх, я ведаю, не раз яшчэ вярнуся,
навек малюнкі тыя ў памяці збярог:
авечкі мірна ходзяць ля дарог
і вартавыя нашых вёсак — гусі.

Радзіма! Вырас я сярод тваіх балот,
не бачыў леднікоў над цішай пракаветнай,
ад сну мяне разбудзіць скрып тваіх варот,
і зноў мне ўбачыцца стары дашчаны плот,
дзе лаз таемны быў у сад ранетны.

Не скарджуся я, не, што ты скупой рукой,
як пасынку, даеш акрайчык хлеба,
на мулкія вузлы гісторыі тваёй,
як на траву, кладуся галавой
з надзеяй на бязвоблачнае неба.

Заўсёды сэрцам я з табой, мой родны кут,
натхняеш ты на працу, захапляеш,
заўсёды сэрцам я з табой, мой родны кут,
раднёй даводзіцца мне працавіты люд,
які праславіў на палотнах Алеш[1].

Я не шкадую, не, што праз тваю красу
пабачыць іншы свет я многа шанцаў страціў,
адну тваю, Радзіма, ведаю красу
і праз жыццё святую мару пранясу —
хоць зернетка дадаць каб да твайго багацця.

---

[1] Мікулаш Алеш (1852—1913) — выдатны чэшскі мастак.

# Ненія

*Памяці савецкіх касманаўтаў*

Па той зямлі, няўстойлівай і хісткай,
што здрапана гісторыяй, нібы
дзіцячымі пазногцямі тынкоўка,
блукаюць зноўку росныя дажджы
і поле зноўку дыхае ўраджаем,
змяняюцца дзень ноччу,
рух спакоем,
надзеі нашы напаўняе рытмам,
і пальцам нашым — вечны неспакой.

Але вось гэты цесны ранак
на горле шрам пакінуў назаўжды.

Прайшло ж адно,
ўсяго адно імгненне
пасля абдымкаў шчырых тых сяброўскіх,
калі яны так лёгка пакідалі
нас, што глядзелі ім услед, у неба,
і залатыя венчыкі укропу
у вёсках родных, і сваіх дзяцей,
іх тварыкі ружовыя надзеяй
ім ззялі ў той бязважкасці глыбокай,
цягнула ноч наперад, каб на карту
нанесці новы зведаны прастор.

Нібы прыйшоў ты да гнязда пустога
і адчуваеш трапятанне крылцаў,
што адляцелі назаўжды адсюль...

Калі б тут нават цішынёй гарэла
смалістае густое дрэва крыку
і статуя кармінавая лёсу
на горла чалавеку наступала,
манетай слепаты закрыла вочы,
яны пабудуць тут, яны, што абагналі
Ікараву надзею. Будуць зноўку
зямны цяжар здымаць з нашых плячэй.

Калі ж трывожным імпульсам-сігналам
з начное цемры неба прыйдзе голас
касмічных зондаў, ён нас адшукае,
што мы дзеля напоўненага імі
прастору сталі шчэ далей ад нашых
дагістарычных дзён — за кошт пульсацый
трох гэтых мужных жыццяў.
Так расце
адвага, мужнасць і бязмежжа волі.
Так і сёння
з рэсурсаў трох навек астылых сэрцаў
уздыме чалавек сваё бяссмерце
як дар, прызванне і пачэсны абавязак.

# Рэчка ў горадзе

Як глядзець з дзесятага паверха,
ты й на рэчку не падобная зусім:
сонна сунуцца па матавай паверхні
караблі ў гранітным рэчышчы тваім.

Ты не ззяеш адлюстроўкамі аблокаў,
што плывуць па-над табой за небакрай,
вечарамі ў чаратах тваёй затокі
не рыкае птушка дзіўная — бугай.

Дзе ж твой бераг натуральны, рэчка?
З дрэвамі, пясочкам і травой?
Дзе абрывы з полымем сурэпкі,
з кветкамі гарчыцы палявой?

Сумна, рэчка, на цябе глядзець мне,
звязаную па руках й нагах,
бо й самому хутка легчы давядзецца
у яшчэ вузейшы саркафаг.

# Азіранне

Год за годам, год за годам —
дзе па мосце, а дзе бродам...

Чайкі над ракой лятаюць,
у дзяцінства дні вяртаюць.

Дзе ж аблокі тыя кучавыя,
што вадзілі журавоў у вырай?

Дзе сцяжынка вузенькая ў поле?
Дзе мая любімая таполя,

а на ёй — гняздо, бусліны клёкат,
што дамоў цягнуў мяне здалёку?

Лінь жа, дожджык, лінь жа на лугі
з-пад плакатнай радугі-дугі!

Век ужо не браць мне гэткай меркай,
як тады піў з поўнага цабэрка.

Шлях бязлюдны, нібыта пустыня...
Мерзне восень у хадзе няспыннай...

*Са зборніка*
# «АГОНЬ СПЯШАЕЦЦА»

*1979*

## У чатырох сценах

За годам год, за крокам крок
твой час імчыцца незваротна.
Пытанне — нібыта папрок:
што даў і што дасі народу?

Глядзіш на плынь ракі з акна
бяздоннай сходкі ці нарады.
Ты — чалавек. Табе здаўна
наканавана быць аратым.

Вясна. Грыміць птушыны грай —
поліфанічнае гучанне.
А ты — інструкцый розных раб,
даклады пішаш для начальства.

І лета працаю кіпіць:
касьбой, жнівом і абмалотам...
Ці ж гэта добра — сыта жыць,
не абліваючыся потам?!.

Калі ж на сэрца ляжа цень
ад крыўд глухіх ці страт жахлівых,
жыццё заўжды перарасце
біялагічную мажлівасць.

І ты ў паперах з галавой
яшчэ душою не счарсцвееш,—
убачыш свет дзівосны той:
трава расце і дожджык сее.

## Тваe аблокі несці

Шматколерны, як радуга над полем,
прыветлівы, як песня салаўя,
прадзьмуты ветрам і, як вецер, вольны,
мой родны край, цябе вітаю я.

Пейзаж-трыпціх твой: лес, вада, узгоркі
не для салонаў модных галерэй.
Сваім настоем палыновым, горкім
душу маю збалелую сагрэй.

Зямля бацькоў і прашчураў далёкіх,
ты для мяне радней за родны дом.
Хацеў бы стаць ракой тваёй шырокай
ці хоць бы вузенькім — у травах —
ручайком.

Так, як яны, жыцця твайго карціны
лавіць люстэркам чыстае вады,
твае яблокі несці ўдаль няспынна,
каб некалі даждж ом вярнуцца зноў сюды.

Падземнай стаць вадою, што спрадвеку
гаючымі крыніцамі звініць,
як песня аб сапраўдным чалавеку,
як спеў пра нашы клопатныя дні.

6. Зак. 725.

## Цяжар

Поўдзень.
З травы сонейка мяне вітае.
Вітае? Не! Краплістай казяўкай
садзіцца на ліст.
А за яго спіной у траве іграе-выйгравае
мелодыю конік — нястомны віяланчэліст.

Гэткі цяжар на целе такім маленькім —
сем вялізных чорных кропак,
сем вяснушак,
сем шрамаў,
сем ганебных слупоў...
З мацярынскім знакам пяшчоты
чакаў бы цябе на каленях,
каб толькі ўраган твайго палу
пад неба прыўзняў мяне зноў.

Ды горы транслізіраваць кахання
яшчэ не ўмеюць,
на схілах сваіх яны песцяць адны міражы.
Занадта ж вялізная скура мая — надзея,
і хутка ўжо ў ёй, як той воўк,
я адзін буду жыць.

Не ведаю, колькі яшчэ мне ісці давядзецца
і колькі тых чорных кропак насіць мне
на кожным крыле,
яшчэ галаву ўпартую і неастылае сэрца,—
ды верш са зваротным адрасам спее ўва мне.

## Пражская вясна

Кожны год цябе, Прага, вітаю на сходцах,
там, дзе бэз расцвітае ля сонечных сцен,
кожны год цябе, Прага, вітаю на сходцах,
а па клавішах стрэх чарапічных лагодна
ветрык бегае лёгкай рукой, як Шапэн.

Не старэюць твае вастраверхія вежы,
у блакіт па-юнацку імкнуцца яны,
не старэюць твае вастраверхія вежы,
купалы іх вісяць над прасторам бязмежным,
як плакат нашай Пражскай музычнай вясны.

Май ахутаў зямлю і цяплом і пяшчотай,
вечарамі склікае да Влтавы дзяўчат;
у наш век неспакойны, імклівы, грымотны
май ахутаў зямлю і цяплом і пяшчотай,
адчыняе ўсе брамы ў квяцісты свой сад.

Я іду, выбіваю абцасамі пошчак,
пад нагамі, здаецца, дрыжыць тратуар,
я іду, выбіваю абцасамі пошчак,
карагодзяць муры на падмеценых плошчах,
пляск іх цёплых далоняў сягае да хмар.

Ад завулкаў глухіх, там, дзе лужы сінеюць,
за нацёртым як след каніфоллю смычком,
ад завулкаў глухіх, там, дзе лужы сінеюць,
па праспектах пяці светлых нотных лінеек
асцярожна мы ў музыкі царства ідзём.

Калі ноч зашпіляе ўсе гузікі-зоркі
і масты залацяцца, нібы галуны,
калі ноч зашпіляе ўсе гузікі-зоркі,
на бульварах і ў скверах змаўкаюць гаворкі
і над Влтавай, бы з піпкі, плывуць туманы.

Златай, Прага, цябе нездарма называем,
наша песня і мара ты, рай наш зямны.
Оду радасці хорам табе мы спяваем,
верым, хутка цябе і ўвесь свет прывітае,
свет без смутку і бед, без хвароб і вайны.

## Дубленне

Мой дзедаў дзед быў гарбаром,
умеў аўчыны ў цэбры квасіць,
рабіць з іх юхт і нават хром.
Мяне ж, кідаючы са стром,
жыццё і дубіць і дубасіць.

Ды веру: продкаў рамяство
і я калісьці ўдасканалю —
зраблю юхт моцны на сядло
ці на бізун, што б'е без жалю.

## Вяртанне

Колькі падэшваў працёр я, колькі прайшоў я
дарог,
каб залатою парою вярнуцца на родны парог;
колькі падэшваў працёр я, колькі з чала
выцер поту,
каб прыхінуцца душою да ветрам
прадзьмутага плоту.

Як на экране кіно, мільгаў-праплываў
далягляд,
вёсны будзілі душу і ў бель прыбіралі
наш сад.
На прыдарожны валун, дзе вершы пісаў
хлапчуком я,
падае дожджык вясновы, падае пыл васільковы,
і бараною жалезнай, што нехта забыў
на раллі,
мне па душы, нібы сотняй іржавых штыхоў,
правялі.

Там, дзе з-за кропу сцяблоў і куста арабіны
дзверы чарнелі нашай старое хаціны,
пуста цяпер — ні кала, ні двара,
ні сцябла,
толькі лапух, над якім безнадзейна
кружыць пчала,
ды камяні з аскабалкамі цэглы ад печы,
з поля бульдозер іх ссунуў, як непатрэбныя
рэчы.

Мог бы малюнак я лепшы сёння даць з вёскі сваёй,
толькі на іншыя плечы спадаюць пялёсткі вясной,
толькі на іншых парогах каціныя бегаюць лапкі,
толькі ўжо іншыя куры збіраюць ля прызбы зярняткі,
толькі ўжо іншыя пахі — пахі бензіну з двароў,
а не вішчанне свіней і не мычанне кароў,
толькі ўжо іншыя пары блукаюць пад месячным ззяннем,
толькі ўжо іншых людзей, вясна, выпускаеш у ранне,
з іншым імпэтам ды з іншаю рупнасцю пчол,
з іншым паглядам на ўсё, што ляжыць навакол;
ты ім адкрыла, вясна, права на веліч турботаў,
ты ім засыпала прорвы і чорныя ямы балота,
ты ім у грудзі ўдыхнула вольны стваральніцкі дух,
ты надала ім імкненне да мэты, паскораны рух.

Як на экране кіно, мільгаюць-плывуць далягляды,
вярнуўся паэт у свой край, пад родныя дрэвы-прысады,
хоча прыпомніць былое, каб з новым навесці масты,
ходзіць, глядзіць і чакае — узнікне сучасны матыў,
нібыта свой запавет, новую кніжку ён піша,
хоча ў душу зазірнуць глыбей і ўзняцца шчэ вышай,

кропелькі поту збіраць, нібыта з кветак
нектар,
адлюстраваць у радках радасць і думак
цяжар.

Мог бы малюнак я лепшы даць з свайго
роднага краю,
зжаць, змалаціць і змалоць збожжа яго
ўраджаю.
Не летапісец я, не! Мне любы й такі родны
край,
хопіць таго, што ў траве булькоча знаёмы
ручай.
На прыдарожны валун, дзе вершы пісаў
хлапчуком я,
падае дождж ык вясновы, падае пыл васільковы.

## Між намі

Усе прадушыны залілі гіпсам,
закітавалі шчыліны ў вокнах
і тады полымем свечкі праверылі,
ці не дзьме.

Як праходзіш каля акна,
пяць крокаў сюды,
пяць крокаў назад,
карціна за акном рухаецца
злева направа,
справа налева.
І змяняецца цяпер, значыць,
парадак карцін.

Святло
пранікае праз нябачную сетку шкла,
лінзай яе акуляраў
перакідваецца на сцяну
платанічнай пячоры.

Увесь свет урываецца праз акно.
Але нябачнаю сеткаю шкла
праходзяць толькі прыглушаныя галасы,
толькі невыразныя, прыглушаныя фарбы,
і ніякія ўжо там пахі не прадзяруцца.

Праз шкло акна не адчуеш
ні мокрага сакавіцкага ветру, напоўненага
налітымі бярозавымі пупышкамі,

ні парфумы дзявочых валасоў,
ні перагнойнага паху грудзей,
падпаленых знутры
крэсівам распускання.

Праз шкло акна не пагладзіш
сямікалернага ката,
калі б ён і грэўся
вось тут, на карнізе.

Карціна рухаецца
злева направа,
справа налева.
Гэта ўсё так пастаянна
і так добра ўладкавана
і прыстасавана да прамавугольніка,
што нічога не перасякае
ні на тым, ні на гэтым баку.
І не патрабуе
ніякага намагання.

Увесь свет там — за акном.
І ўласна гэта ўвесь свет.
Але ж за акном.

## Спажыўцы

Перапонка абыякавасці — на вачах,
вата безадказнасці — у вушах,
толькі пальцы адчувальныя, як адвёртка,
якой можна рэгуляваць на поўных абаротах
сваё сямейнае жыццё.

Перапонкі абыякавасці — на вачах,
вата безадказнасці — у вушах,
толькі аўтамабілям марак замежных —
вымучаная зайздрасцю ўсмешка.
І песня прагоркла на іхніх вуснах,
як застарэлы марцыпан,
а з іхніх прыёмнікаў і магнітафонаў
вылятае пошасць мастацкіх ласункаў.

Прагуляйся па асфальтавых лугах
суботніх вёсак,
маліся аб поспеху ў паломніцкіх касцёлах
інтэратэляў
і ў каплічках прыгарадных піўнякоў.
Не адгукнуўся ім горлам бясхітрасны смех,
не зарыпеў ім пад нагамі чысты снег,
хіба толькі на горных схілах
пад дарагімі імпартнымі лыжамі.

Вечарам распранае, як навагоднюю ёлку,
ад якой ужо не чакае ніякіх цудаў.
Раніцой прыбіраецца ў спартыўны гарнітур
хцівасці,

каб дзе што ўварваць, выманіць, выменяць.
Вярнуўшыся, лічаць свае выйгрышы.
Не заспявае ім жывы агеньчык у грубцы,
толькі зрэдку ў радыятарах забурчыць,
як у перанасычаным страўніку.

Каму мы засталіся вінны і за што?
Чаму разбухаюць у мяккіх крэслах кватэр
і транспарту
людзі, якія лянотай спапяляюць жыццё,
да якога так цяжка адшукаць запчасткі?

Каму мы так безаглядна прадаліся,
што столькі рук адвыкла ад працы,
павярнулі далоні ўгору,
як сонная рыба,
як шапкі жабракоў,
што чакаюць не меднай манеты,
а каштоўных дарункаў?

У той час, як самі мы ходзім
на штодзённую змену
з бітончыкам горкай радасці
і бадзёрага неспакою.

## Пісьмо

Са дна душы выплаўлена
па самыя вяршыні гор:
усе годы, усе годы
моцна зрослы з бедным дваром,
пакладзены на чужы агонь
сваімі смалістымі галінкамі,
напяты паміж рагоў
карыдных быкоў,
прапушчаны праз соты пчол,
выедзены аж да дна,
аблямаваны агністай стужкай
выбухаў і катастроф,
напоўнены бясконцымі турботамі,
паміж дзвюма галінкамі маланкі павешаны
на тоненькай павуціне
і аглушаны злоснымі маршамі,
о год, старэйшы за ўпартасць штодзённую.

Так было, так было.

Хто мне хоча тлумачыць,
што мы ўласна ўсе прыйшлі,
калі толькі ўчора затопалі па зямлі,
калі мы з купецкага кашалька
узялі і тую шчопаць, і тую шчопаць,
што хацелі пакінуць некаму.

Хто мне хоча тлумачыць,
што мы паменшылі шанцы,

што мы праваронілі выгадную здзелку,
выгадны продаж шматка зямлі пад нагамі,
што мы пратаргаваліся
на біржы свету.

Хто мне хоча тлумачыць,
на які бакір я павінен насіць кепку
сваіх радасцей, сваіх пакут,
хто, як тая расамаха,
і сёння выядае мае соты
і выплёўвае цёплы воск
між камянёў маёй дарогі?

То меўся б усіх прыкрыць уласнай скурай,
то дэлювій, той пераджыццёвы нанос
ад лужыны да лужыны
тыя хітрасці, здрады, распусту
прыкрыў бы ўласнай скурай,
прыгожа распісанай,
то хацеў бы закапаць
капыткі нясціплых успамінаў
пад скалісты парог?
Не змоўчу ані слова!
І спяваць, спяваць буду па-нашаму,
са дна душы выплаўляць
аж па вяршыні гор.

Па небе бяжыць сінява,
а сцяжынкай — дзеці,
на гарачых вуснах — крупінкі поту
ад хуткай хадзьбы.

Якія мне сёння прынесяце пісьмы?
Якія навіны маеш ты, Муза?

## Шчасце

Колькі разоў гэта было толькі пёрка анёла,
якое вось-вось упадзе на нашы павекі,
салаўіная струна чакання нацягнута
аж да болесці,
рукі падманліва апушчаны
ў глыбокую поўсць раскошы
на хрыбце пырхаючай хвілі;
заўсёды гэта быў толькі міг,
заўсёды толькі «залатая мушка»,
заўсёды птушынае малако,
заўсёды быццам украдкай сторазовае мілаванне,
якое ўмее хутка надзяваць
шапку-невідзімку — і знікае.

Але сапраўднае, сапраўднае шчасце?
Яно мае адну ўласцівасць: заўсёды наперадзе.
Толькі яго ўбачыш, выпарваецца, як эфір,
але ап'яніць цябе і тым знікненнем,
і тым следам водару,
што застаўся ў паветры.
Заўсёды яно наперадзе і кліча цябе да сябе.
І, як матор, раскручвае ўнутраныя механізмы.
Спыняешся на ўсіх скрыжаваннях,
абмытых свежым ветрам.
Спыняешся на ўсіх вуглах,
падмочаных сабачымі знакамі,
і гадаеш:
«Ішло яно проста ці завярнула куды?»
І так праходзіш дні, гарады і гісторыю

па ўсіх кантынентах сну,
па ўсіх прыступках імкнення,
стагоддзямі прэтэнзій і пакут,
мясцінамі поту, што на тваім камбінезоне
працу тваю адзначае штодзённа.
Так праходзіць твая маладосць аж да лета:
ішло яно проста ці завярнула куды?
І цяпер, калі чэрвень ва ўсёй славе крочыць
па кацiных галовах канюшыны,
бачыш хутка і ўжо назаўжды:
яно далёка наперадзе
і за дзве хвіліны раздрапае босыя ногі
аб іржышча,
з якога ўраджай звезлі да іншых стадол.

Але ты не можаш, ты не смееш спыніцца.

Цяпер сапраўды твае павекі пагладзіла
тое райскае пёрка,
салаўіная струна салодка вібрыруе, аж шалее
і — бягучыя імгненні, прадоўжыцеся —
поўсць бясконцае раскошы
сапраўды трэцца аб твае лыткі.

Але ты
мацней сцягнеш расслаблены вузел надзеі
і пойдзеш напрасткі полем,
цяпер ужо незалежны ад ураджаю,
цяпер ужо пастаянна і роўна
аж да таго маленькага грудочка зямлі
на небасхіле.

## Далёка і блізка

Перад палётам у Трансільванскіх Альпах
глядзеў я на вяршыні,
дзе вечныя ляжаць снягі.
Між імі і вачамі маімі
восень павесіла вэлюм блакітнай смугі
над поўнымі рыку аленя лясамі,
пад поўнымі сонных віхураў ярамі,
дзе ноччу, нібы вугалькі-светлякі,
вочы рысі гараць.
Альпы! Чужой далячыні кругі
сэрца маё ледзяняць.

Мне паказалі тую вырубку.
Знайшлі на ёй чатырох хлапчукоў,
знайшлі на ёй малых разарваных хлапчукоў,
чатырох пастушкоў тут смерць падпільнавала,
калі яны гналі з пашы кароў,
бомба на іх з самалёта ўпала.
Вершам над тымі ахвярамі плачу я.
І тая доўгая, доўгая даль
згарнулася ва мне
ў адну слязу гарачую.

А праз тры гады
адчуў я на скуры сваёй
воўчыя зубы, што з прагнаю сілай
рвалі і ў зяпу сваю зацiскалі
маленькую зямлю на раўніне
з прыгожай старой назвай — Гватэмала,

яна таксама была мне і блізкай, і мілай,
як уласная магіла.

Пасля паказалі мне гадзіннік
французскага партызана,
на ім іржавела маленькая кропля крыві —
жывая адкрытая рана.
І сын партызана
на вуліцы, дзе яшчэ «Марсельеза» звінела,
плады каштаваў пераможнай той бітвы —
паліцэйскую дубінку
і газ слезатачывы.
І тая Францыя,
гісторыю якой мы так шанавалі,
знікла для мяне ў касмічнай далі.

Далёкі і блізкі
мой свет.

Чую здалёку Поля Робсана,
коціцца песня, як Місісіпі хвалі цяжкія.
Але цячэ ў маіх жылах
гарачая кроў Джона Кінга,
негра і лекара,
застрэлілі яго праз акно, уначы,
як на палкавым стрэльбішчы,
калі ён збіраўся да хворага.

Ані за сто гадоў
летапіснай Тацытавай Амерыкі
не замазаць вапнай прыгожых слоў
і гэтую яшчэ адну
апырсканую крывёю сцяну.

Далёкі і блізкі
мой свет.

Таксама чую і цябе, Рыцас,
нібыта ты зусім блізка,
як быў блізка Назым Хікмет
у камерах Царграда,
ты так блізка са сваімі песнямі,
што я падпяваю табе,
ратуючы землякоў тваіх ад голаду.

Далёкі і блізкі
мой свет.

А потым стаю з табой, Ашанін,
ля нашых ног плыве Волга,
шырокая, як лёс.
І з той сталінградскай далоні
за нашымі спінамі
рассяваюцца вайне праклёны,
дзе рваліся гранаты і міны,
растуць пшаніца, памідоры і дыні,
пахне мірам, хлебам і кменам.

Далёкі і блізкі
мой свет.

Зямныя прасторы закураны,
вітаю твой выхад на свет,
мой антыпод, босы брат мой,
чаго ты хаваешся ў джунглях Суматры?
Хопіць туліцца ў куточку
з дзіцячай наіўнасцю ў паглядзе.
Будзь да нас бліжай
у залах палацаў
Масквы і Парыжа!

Далёкі і блізкі, далёкі і блізкі
мой свет.

Гадамі пішу гэты верш нетаропкі,
далёка яшчэ да апошняе кропкі,
кожны дзень выплываюць з-пад рукі
церпкія, як дубільная кара, радкі.

Далёкі і блізкі
мой свет.

Калі дзесьці на свеце ёсць голад,
і я галадаю
усімі рытмамі песні маёй.
Калі дзесьці на свеце ёсць смага,
я яе наталяю
песняй церпкай сваёй.
Калі брата майго дзесь знясілілі будні,
няхай чэрпае сілу з маёй песні,як са студні.

Далёкі і блізкі,
далёкі і блізкі
мой свет.

*Са зборніка*
# «БЕРМУДСКІ ТРОХКУТНІК»

*1982*

## Не хачу!

Я не хачу славутым быць,
звінець квяцістымі радкамі,
калі ў напале барацьбы
гарыць планета пад нагамі.

Я змог бы нюхаць пах травы
і слухаць песню салавейкі,
хаваць бунтарнасць галавы
пад размалёваныя вейкі.

Ды не магу з пустых радкоў
вязаць замілавання строфы,
бо трэба вершам, як рукой,
свет засланяць ад катастрофы.

## Бермудскі трохкутнік

Тут усё знікае без слядоў...
Плешча лена мора, таямніцу
ад людзей замкнуўшы сто разоў,
быццам бы Мікенскую грабніцу.
Час плыве, разгадкі не дае
прагнасці пустыні гэтай сіняй:
колькі ўжо ахвяр ляжыць на дне,
колькі прападзе яшчэ ў глыбінях?..
Сэрцу тлумна ў цеснаце грудзей.
Думка мкне за ветразем напятым:
хто падкажа мне, калі і дзе
сыдуцца жыцця каардынаты?
З крылаў, на якіх лунаў Ікар,
кроплямі расплаўленага воску
ападае ўсіх эпох цяжар,
каб падзеннем мераць прорву лёсу.
Кожны дзень у бездань мне ныраць.
Без прыбораў лёгка з курсу збіцца,—
сто разоў замкнецца думкі гладзь,
быццам бы Мікенская грабніца.
Памяць, інтэлект і пачуццё —
вось душы Бермудскі мой трохкутнік,
ён імкнецца праглынуць усё,
што прыносіць радасць і пакуты.
Буду ўдзячны хвілі той адной,—
вытрасе яна з мяне дачыста
цемру, што дружыла з глыбінёй,
каб заўсёды гладзь была іскрыстай.

## Галавакружэнне

Адсунуў снежную газету,
не дачытаўшы, сакавік.
І ты пачуццямі сагрэты:
май — на двару,
май — у крыві.

Чытачкам бледным неадкладна
дай вязку полымных радкоў,—
вядзе іх нітка Арыядны
да неадкрытых астравоў.

Бунтуй, ірвіся ў высі смела,
пі шчасця хмельную брую,
пакуль цвярозасць не раз'ела,
як лейкемія, кроў тваю.

Вандровак сэрца не баіцца,
яму карысны неспакой,
інакш ці ж дойдзеш да крыніцы,
як не сцяжынкаю крутой.

Няма ў гарах нідзе зацішку —
дзьме вецер і мароз пячэ...
У прорву палкасці ляціш ты,
як меч, што галаву сячэ.

## Дзень без цябе,
## дзень без паэзіі

Дзень — як віёла без струн і смычка,
дзень — як шчупак, што сарваўся з кручка,
дзень — як пад смеццем і друзам крыніца,
дзень — як без газы і кноту газніца,
дзень — як прабіты білет на трамвай,
дзень — як вароты замкнутыя ў рай,
дзень — як абрэз ненапісанай кніжкі,
дзень — як кашуля без жычкі й манішкі,
дзень — як дзіцяці галоднага плач,
дзень — як на дрэве бязлістым крумкач,
дзень — як на ложку смяротным каханне,
дзень — як загубленых душ пакаянне,
дзень — як узмах перабітым крылом,
дзень — як зімой неацеплены дом,
дзень — як маёнтак, у карты прайграны,
дзень — як у дождж парасонік падраны,
дзень — як пусты і патрэсканы збан,
дзень — як зацемнены кінаэкран,
дзень — як без зорак каляднае неба,
дзень — як вячэра без солі і хлеба,
дзень — як бясконцы, без веснічак, плот,
дзень — як дарога на эшафот.

## У гэтую хвілю

Па набярэжнай ідзе вясновае наступленне
дзіцячых калясак.
Пад выбухі бэзу
метр за метрам
заваёўваецца новы блакітны мацярык,
і радасць хвалямі адплывае за спіны,
як атака пяхоты.
Але я толькі што ўстаў, неспакойны,
з абгарэлымі вейкамі,
нібыта ўсю ноч прахадзіў, і толькі пад раніцу
я праваліўся ў сон, як у палаючы стог сена.

Калі б выгарэў увесь горад і замест вокнаў
глядзела на нас толькі чадная пустата
з голых рам
і дзеці, засцігнутыя ў сне,
усеўшыся на клункі наспех сабранага адзення,
спрасонку плакалі,
наўрад ці такое можна было б уцiснуць
у верш,
які б праклінаў ананімны лёс.

Але ў гэтую хвілю
уяўнае полымя аблізвае цэлыя кантыненты
і хтосьці рэальны пад вашыя вочы
падштурхоўвае прывіды дзяцей,
уціснутых у сцяну, як хірасімскія цені,
уяўленні захуканых дыханнем адчаю
вокнаў Дантава пекла,

пустыя сілуэты таго,
што нядаўна абуджала асалоду,
прызначаны агню вярблюджы гной
на сценах берберскіх дамоў,
сёмую пячатку Апакаліпсіса,
канчаткова невыратавальнае Ніштто.

Як жа цяпер праклінаць ананімны лёс?

Па набярэжнай ідзе вясновае наступленне
дзіцячых калясак,
метр за метрам
заваёўваецца плошча блакітнага дня.
Але ў гэтую хвілю
каўбой з дзікіх прэрый
у сваёй непрыгляднай апошняй ролі
нападае на паштовую карэту нашай гісторыі
і намервaецца паставіць на дыбы планету
шпорамі пагібелі.

У гэтую хвілю
артыст, адукаваны як сякера,
чалавечны як сякера,
гаваркі і пераканаўчы як сякера
падсякае тысячагадовыя секвоі,
якімі захапляўся Дарвін,
і ўсё тое, што засталося
ад магутнага дрэва дэмакратыі,
якое пасадзіў Джэферсан.

У гэтую хвілю
рэальны падпальшчык, як вывернуты Праметэй,
спрабуе пакласці чалавецтву на парог
не благаславенне агню, а праклянцце агню.

Як жа цяпер праклінаць ананімны лёс?

Па набярэжнай ідзе вясновае наступленне
дзіцячых калясак.
Але ў гэтую хвілю
з чыстай вады Марка Твэна выплывае
абляпаная мазутам смярдзючая істота,
ад праслаўленага Джэкам Лонданам
рамантычнага Клондайка
распаўзаецца залатая ліхаманка,
ахоплівае зямлю,
прыласканую падэшвамі Уолта Уітмена,
і з мільёнаў малых няшчасцяў,
экспартаваных ва ўсе часткі свету,
штампуе вялізныя залатыя цагліны.

У гэтую хвілю
нейтронныя скарпіёны штурмуюць
брамы радзільных дамоў,
крылатыя ракеты, як кажаны,
павісаюць на фіранках
і сквапнымі вачамі лічаць нашых дзяцей.
У гэтую хвілю
рэальны падпальшчык,
як навыварат вывернуты Праметэй,
рыхтуе сваім багам ахвяру.

Але, як у старых этрускіх прароцтвах,
першая маланка, папярэджваючы,
засіпела над яго галавой.

У скляпеннях Нюрнберга
марна намагаецца пыл
засыпаць народную памяць.

У скляпеннях Нюрнберга
яшчэ трубяць
трубы трыбунала.

Але і сёння
разбухаюць в'етнамскія студні
непахаванымі цельцамі дзяцей,
але і сёння
халодная рука злачынца
цягнецца да смяротнай ін'екцыі,
але і сёння
бязродная, як воўчае дзярмо, смерць
перапісвае свае хімічныя
і фізічныя формулы,
але і сёння, як піраміды фараонаў,
ляжаць на змучаным целе Афрыкі
голад і непатрэбная чорнаму люду
аўтаматычная зброя,
але і сёння
лацінскі свет напяты на дыбу
паміж спёкай Сальвадора
і марознай ноччу Патагоніі,
уся тая частка свету шматколерных народаў,
джунгляў і птушак
ведае толькі адзін колер — колер крыві.
І сёння
уся планета ўздрыгвае,
як змучаная бычыная скура,
якую б'е бізун,
якую даймае гнюс.
І ўвесь час для столькіх адкрытых ранаў
не хапае рук!
І трыпутнік здзіўлена азіраецца —
куды раней прыкласці лісцік,
рамонак сашкрабае гной.

У скляпеннях Нюрнберга
яшчэ чутны
трубы трыбунала.
Але хто хоча ўжо цяпер напалмам сцерці

адрасы планеты,
нібы няправільна выкананы ўрок?
Хто хоча сарваць з дрэва лісце,
як вэлюм нявесты на выдратаваным ложку
зямлі
Хто вышывае рызу ў нядзелю
і ў будны дзень
рукамі мясніка корпаецца ў шлунках чалавека?
Хто нязваны носіць у чужыя дамы мор
і магільны бруд?
Хто сяброўскім жэстам
навязвае сваім васалам фальшывы вэксаль,
па якім можа інкасаваць толькі смерць?
Ніхто так не баіцца цемры,
як той, хто яе сее.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Як у прароцтвах старых этрускаў,
другая страшная маланка распісалася на небе,
і няма ёй справы,
над чыімі галовамі яна лунае.

Калісьці
бацьказабойцу зашывалі ў мех
разам з сабакам і змяёй і кідалі ў рэчку.
А што рабіць з забойцамі бацькоў?
Сыноў і ўнукаў? І матак, і дачок?
Што рабіць з глашатаямі лакальнай вайны —
абмежаванымі мільёнамі мёртвых?
Людзі, не давайце адурманьваць сябе,
усё пастаўлена на карту, і няма часу
на разважанні.
Адзін націск атамнай кнопкі,
якая знаходзіцца
на адлегласці шалёных пальцаў,
можа агністымі літарамі перапісаць
усю гісторыю чалавецтва.

Людзі, над вамі ўзвышаецца неба
ўсіх пяці кантынентаў,
неба, якое абапіраецца на вашыя плечы,
трымайце яго моцна ў час свайго
вясновага паходу.
Няхай счарнее, як абгарэлая галінка,
язык хлуслівы і крывадушны,
няхай сіла, здольная давіць,
пазнае веліч сваёй слабасці.
Кожны чалавек, з якога не выпарыўся
эфір чалавечнасці, хоча ведаць,
каму з даверам можна пакласці руку на плечы,
каму адкроіць лусту
з вялікага бохана сяброўства,
з кім падзяліць смятану радасці
са сваіх гаршкоў.

Радасць? Радасць — што гэта такое?
Адкуль прыходзіць яна ў наш дом?
Што яе выклікае?
І галінка свабоды — для каго расце?
Каму аддасць плады?
Для каго зазелянее праз год,
праз сто гадоў?
Цікавяць мяне карані дрэва,
тоненькія валаскі, кара і лыка,
і не толькі адна галінка свабоды,
а ўся раскошная крона
з мноствам іншых галінак.
Таму і сачу я за маланкамі.

Ведаю, што толькі разам мы здольны спыніць
трэцюю пагібельную маланку
этрускага прароцтва.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Па набярэжнай ідзе вясновае наступленне
дзіцячых калясак.
Светлячкамі дзіцячых вачэй
вызначаны праходы
на мінных палях сённяшніх катаклізмаў.
І радасць хвалямі адплывае за спіну,
як атака пяхоты.
Сотні разоў заклікаем мы тую зямлю,
поўную надзей,
прыгод, узрушэнняў,
штодзённых гераічных подзвігаў,
усюдных у сваёй палаючай сіле.
Сотні разоў заклікаем
спешку яе звычайнага дня,
калі неразрыўна нараджаецца нязвыклае,
асветленае палкім дотыкам таленавітых рук,
калі кветкі ператвараюцца ў плод,
поўны насення
будучыні ўжо агульначалавечай.
Як валуны ў рацэ, будуць трываць пакаленні,
як тысячагадовыя цісы, прарастуць пакаленні.

Яшчэ няскора астыне сонца, і мы да таго часу
зможам абагрэць космас
сваім чалавечым вынаходствам.
Зямля стане мацеркай
для ўсіх дзяцей, якіх народзяць
людскія мацеркі.

Ужо світае. Туман развейваецца.
Іншым гэтага
яшчэ не відаць. Яны
праз закуранае шкло назіраюць зацьменне
свайго ўласнага сонца. Але мы
падстаўляем твары чыстаму ветру
наступных дзён.

*Са зборніка*
## «КАЛЯНДАР»

*1986*

8. Зак. 725.

## Гісторыя кахання

Яшчэ яно звініць
разладжанай скрыпкай.
Нібы крошка фосфару
на дне душы.

Выгнанец будучы,
лагчынкай між грудзей
дзярэшся ў рай.

Жанчына адчыняецца
то вечкам студні,
то — пудраніцай,
то — як труна.

Шчаслівая ўнутры,
маўклівая на выгляд.

Цябе абдыме ўздыхам,
буханкамі каленяў спакусіць,
плачам падсоліць,
а ў другой руцэ — нож.

Ды гэты шрам — раскоша
пасля першага граха,
пасля апошняга пакаяння,
гэты шрам — раскоша.

Яшчэ яно звініць
разладжанай скрыпкай,
усёй даўгатой твайго жыцця.

Заплача Эрынія,
так жаласна заплача Эрынія,
а ў другой руцэ — нож.

Ты ведаеш і бачыш,
ды мусіш усё гэта
на ўласнай скуры
выпрабаваць.

Як вопытныя вінаградары,
пад карані лазы
пасму валасоў дзявочых
закапаеш.

## Апакаліпсіс

Чые вочы бачылі!
Чые вушы чулі!
Дэспат корпаецца у чалавечых чэравах
і цмокае языком агню.

Усмешка, як разлітае малако,
пастаянна камусьці ўзбівае зямлі пярыну,
пастаянна камусьці пад парог падкладае міну,
пастаянна выцягвае фальшывую карту
з рукава гісторыі
і пускае яе ў гульню.

Дэспат корпаецца ў чалавечых чэравах,

маршыруе па руках,
але толькі бруд пад пазногцямі
абмяжоўвае яго пыху,
генетычны код гешэфту
нарывамі раз'ядае яму фізіяномію.

Яго думка — як папярочнае бервяно,
пастаянна прыгатаванае
для чужога распяцця.
Яго праўда
начуе з клапамі.
Вывернутыя словы
калючкамі ваўнутр,
вывернутыя словы
брудам бархату звонку.

Але масавыя магілы
не вывернеш,
як пустыя кішэні,
без пагашэння.
Рэгаліі паважай,
украдзеныя, зацяганыя —
і мы маўчым?
Мы на сцяне пакажам
тэатр ценяў?

Час не вяртаецца сам у сябе,
як бы мячом не мяшаў пахту.

Праз могілкавую сцяну гісторыі
пазірае сплюснуты твар адплаты,
з вузкімі губамі,
неміласэрны.

## Галасы

Нібыта зажурчыць ручай,
будзільнік запяе,
над вухам крыкне: «Уставай!»
Што зробіш? — устаеш.

Спрабуеш адамкнуць ключом
куфэрак мудрых слоў,
ды з'явіцца аднекуль гном —
пакліча зноў на лоў.

А гном другі нырне без віз
на дно граматыкі.
І сонца асядлае фрыз,
каб блытаць паплаўкі.

Так з раніцы твой лепшы верш
грызуць сусед, радня...
Раней, чым ты пісаць пачнеш,
глядзіш — міне паўдня.

І зноўку беды ад абеду,
пад смех дачок, сыноў
знікаюць некуды без следу
твае задумы зноў.

Дыхне каварствам вечар хісткі,
як не адолеў дзень,
дык ноч, бы тая акультыстка,
у сон ружовы павядзе.

## Нарэшце

Была прыгожая, як шоўкам тканыя пальцы
месячнага святла.
Была прыгожая, як лапкі сіямскіх кацянятак.
Была прыгожая, як грэбень хвалі,
якая пасля спаткання з берагам расплывецца.
Была прыгожая, як рэха,
якое аслабела і само сябе шукае
ў люстэрку паветра.
Была прыгожая. Але было ясна,
што яна толькі драбочкі
з Клеапатрынай хацінкі.

Сто разоў паўтарала: «Не люблю маліцца
на чужой пасцелі, за чужыя грошы».
Сто разоў падцягвала да горла
карункавы плед
і peralічвала на ім вочкі
тайных мужчынскіх паглядаў,
але не далічылася.

Аднак хапіла аднаго душнага ліпеньскага дня,
каб разбіла ўсе свае люстэркі
і ўбачыла за імі толькі пустату.
І тады журботна зашаптала:
«Не хацела я маліцца
на чужой пасцелі і за чужыя грошы.
Але райскі вобраз усё ж праціснуўся
праз дзіравае пакрывала».

## Імгненне

Хадзіў ты па дарогах,
блукаў па сцежках росных,
пад золкімі вятрамі
і ў спёку, і ў мароз.

З адлегласцяў засохлых,
нібы з гадзючай скуры,
ты вылузнуўся спрытна,
прыйшоў на свой парог.

І ліпа самагубцаў
па-над глухой дарогай
жыццё прарочыць сёння,
на цвет склікае пчол.

А воблакі, як гербы,
на чэшскім нашым небе
плывуць і абяцаюць
нам ураджайны дождж.

Усё мяне гукае
і шчыра запрашае
на рыбныя прасторы
вярнуцца найхутчэй.

Той голас мне вядомы,
не прапушчу яго я,
ён вучыць жыць у згодзе
і ў час пакінуць свет.

## Дарога

Імчацца эшалоны
тваіх былых сяброў.
Над імі — перазвоны
і смех былых гадоў.

На сцёблах дыху віснуць
даспелыя жыцці.
Паглыбілі іх рысы
няўмольныя разцы

той мітусні трывалай,
туманіць што мазгі,
калі не адчуваеш
зусім сваёй вагі;

калі ўжо не вадзіцай
кроў бачыш, а крывёй.
Усцяж сцяны прайдзіся —
абрыс пакінеш свой.

І толькі надвячоркам,
калі прывянеш ты,
убачыш на пагорку
свой купал залаты.

## Усё часцей

Усё сваё юнацтва я глядзеў з акна
на мокрую ад дажджу сцяну,
на якой фантазія малявала прыгожыя карціны.
Было гэта, як бег скрыпкі ў канцэрце
Чайкоўскага,
аж на самым дне прыгажосці.
З кожным годам усё менш і менш
падабалася мне рэальнасць,
бо неба жахліва кляне бедных
менавіта толькі над хлебным полем фантазіі.
Крадком адшчыпваў я маленькія крошкі
з вялікага паэтычнага бохана
фантастычнага жыцця.

Усё сваё юнацтва я глядзеў на мокрую сцяну
і сёння слаўлю той цудоўны экран,
на якім змешваліся светлыя сны
з шэрым пылам паўсядзённасці.

Успамінаеш, нібы зноў праходзіш знаёмай
вясковай плошчай,
раз'езджанай за лета коламі падвод
з цяжкімі паклажамі катаржных дзён,
і звяканне бліскучай збруі
не заглушае цяжкіх упартых крокаў.

Успамінаеш, нібы праходзіш усе мінулыя дні,
як той фатограф, які раптам знік
пад чорнай накідкай

і сам сябе цешыць:
«Увага, зараз вылеціць птушка!»
Але заўсёды вылятаюць толькі зграі варон
і ніколі — стракатыя калібры.

Як канатаходцы,
мы ходзім па сярэбраным праменьчыку надзеі,
і лёгкае на ногі шчасце
заўсёды — перад намі
у яркіх, вышытых бліскучай лускою, адзенні,
але заўсёды за некалькі крокаў наперадзе.
Здаецца, вось-вось схопіш яго рукамі,
і ўспамінаецца вясковы кегельбан,
ахутаны пахам лізаліну,
тое адчуванне, калі вось-вось
адной палкай зваліш усе дзевяць фігур,
што цяпер гэта і ёсць тая адзіная хваля,
той міндаль, запечаны ў турэцкім мёдзе,
тое латуннае сонца,
што ззяе над цырульняй.
Але потым бачыш, колькі бездарожных
матляецца ў жыцці,
нібы ў коле
на танцавальным паркеце няўпэўненасці.
Але потым бачыш,
стэнаграма алеі бяжыць
па заснежаным квартале бясконцых тыдняў
і знікае ў святочнасці без расшыфроўкі.
Але потым бачыш
шэры аўтобус з кратамі на вокнах,
біткам набіты маўклівымі з касымі паглядамі
штрэйкбрэхерамі,
і бацька садзіцца каля акна,
выглядае лістаносца,
двойчы за дзень абмотвае шалікам шыю
і спяшаецца на стачачнае патруляванне.

Увесь свет круціцца вакол
мамінага чыгунка бульбы,
у якім усё часцей і часцей
бачым выцертае дно.

Начапураным пеўнем зноў і зноў прыходзіць вясна.
Жоўтымі пырскамі гусянят ажывае газон
тваіх наступных гадоў,
новымі адкрыццямі, якія леташняя восень
забылася замесці.
Вясна заўсёды мае агністыя фарбы,
і анучны мячык з прадмесцкіх пляцовак,
які ўсё часцей у тваіх руках ператвараецца
ў глобус,
на які твая фантазія наносіць абрысы
далёкіх кантынентаў
і зямлю, якую засяляеш вясёлкавымі птушкамі
і дзівоснай сакавітай раслінай,
па вяровачнай лесвіцы залазіш
у жульвернаўскі балон паветранага шара,
і каляровы фільм краін бяжыць пад табой,
і ўвесь свет табе належыць,
як гэты анучны мяч каля ног.

Так вось і ходзім па сярэбраным промні надзеі.

Але потым бачыш дні, якія мільгаюць,
як рамантычны калейдаскоп імклівых каруселяў,
на якім пастаянна мяняюцца фарбы,
твары і групы,
але не набываецца сэнсу.
Гэта — толькі паўторныя кружэнні
з ніадкуль у нікуды,
зашнураваныя ўзыходзячай стомай
і размытыя раннім змрокам.

Так увесь час — на апошняй пляцоўцы жыцця
і пастаянна вочы — на секундамеры.
Пад пякучымі звонкімі ўдарамі лапат
на вяршыні неабходнасці
стынуць усмешкі хлопцаў, якім я зайздросціў
за іх трапныя пападанні ў цэль
на сваточных стрэльбішчах у прадмесці.
У шынку, з яго ж лавак уставала надзея,
такая ўседлівая,
што не выслужыла рэкруцкага букета,
дзе кожная рыска на падносе азначала
адну зорачку
на пагонах смелага ўзбуджання,
дзе хлапецкі голас паганага фурыянства
вылятаў аж пад зялёную зорку, што завецца
Сірыус,
у тым шынку апошнюю шклянку
ужо ніхто не дапіў,
і рука здранцвела на паўдарозе да вуснаў.

Яшчэ раз нясмела падняўся той хлапецкі
голас,
каб у ваенным світанку
расплыцца ў вялікім цыкорным кафейніку.

Ці ёсць што на свеце больш сумнае,
чым хлапецкія рукі, складзеныя на каленях!
І ўсё ж ходзім, як канатаходцы,
па сярэбраным промні надзеі
і апошнюю шчопаць мукі змятаем
на дрожджавую закваску.

Такі быў далягляд тваёй маладосці.
Было такое? Але ж, было:
дзёрзскасць, адчай, дзёрзскасць, адчай,
як гадзіннік з маятнікам,

гадзіннік, з якога толькі раз за тыдзень
выгляне зязюля,
каб адлічыць табе порцыю радасці.

Было такое? Але ж, было:
за сцятымі зубамі поўны рот
стрыманых рыданняў,
за сцятымі зубамі поўны рот
злосна выкіпелага спеву,
гневу, упартасці і надзеі.

Цяпер нарэшце гэты куток зямлі наш.

Але колькі гадоў крыўды і барацьбы
мусім яшчэ прайсці
раней, чым нам будзе належыць увесь свет,
як той паэтычны анучны мячык!

Усё часцей цяпер прыцягваю той палкі экран,
усё часцей бачу гразкую сельскую дарогу
і дворык у прадмесці,
усё часцей бачу тых некалькі ўпартых галоў,
якія перадавалі з вуснаў у вусны
адну выклепаную зорку, якая хутка
змяншаецца,
за прытворнымі вейкамі прывіду наступнага
справядлівага свету,
прывіду, які спапяліў мяне сваёй прыгажосцю.
Усё часцей цяпер пераграбаю вогнішча памяці
і ўзнаўляю карціну спраў, даўно мінулых,
каб вярнуць іх неяк у жыватворны
будучы агонь

Як піла падлічвае сваімі зубамі
гадавыя колцы дрэў,
усё часцей
падлічваю я гадавыя колцы свайго жыцця,
каб яны напоўнілі звонкае дрэва скрыпкі
неаправергнутай людской надзеяй.

*Са зборніка*

# «ГРУГАН НЕ ПРЫЛЯТАЕ З БУКЕТАМ»

*1988*

# Не ўпершыню вясна

Вясна, вясна! Не ўпершыню снягі з палёў
зганяеш,
не ўпершыню на рэках гоніш
караваны крыг.
Пагодных пару дзён —
і што зрабіла ўжо ты з нашым краем,
Ажно займае дых!

Вясна, цябе заўсёды
сустракаў з паклонам я,
маўляў, чало мне
сонцам і дажджамі абмывай!

А ты зубамі горла сцяла мне, шалёная.
Ну і няхай!

Не абураюся я, не!
Я толькі захапляюся,
здзіўляюся ўсяму,
смяюся, як дзіця,
дых затаіўшы,
ціхенька ўглядаюся
і ў ладкі пляскаю
трываласці жыцця!

## Зноў і зноў

Зноў іду я родным краем,
як калісьці, як калісьці,
наваколле разглядаю
прагным вокам хіжай рысі.

Без дарог я шмат блукаў,
покуль выйшаў на прадмесце.
Шчасце й гора утаптаў
у зямлю, нібыта ў цеста.

Дзе ён, рыссі зрок той мой?
Дзе сардэчныя ўсе буры?
Сіні дым — над галавой,
сажа чорная — на скуры...

У вушах, як і раней,
зазвінеў матыў вясновы.
І папера зноў мяне
спакушае чысцінёю.

Вось і ручка ўжо ў руках —
і сцякае палахлівасць
па дзіцячых чарапах,
сфінксавых каменных грывах.

9. Зак. 725.

# Інтуіцыя

Наперад гоніць прага славы.
Бягу па выгібах сцяжын
праз перавалы,
пераправы,
па цаліку без каляін.
Іскрынкі золата шукаю,
як той старацель, дзень у дзень,
пясок радкоў перамываю,
ды золата няма нідзе.

Не апускацца ж да падробкі!..

Над кнігаю жыцця карплю
(яе ніхто не дачытаў,
лісткоў, дзе соль, не заламаў),
жывыя мудрыя старонкі
я інтуіцыяй лаўлю.

# Груган не прылятае з букетам

Даручэнне з выраю прынесці
ластаўкі стараліся ў наш дом —
абуджаць і славіць шчырай песняй,
што не з'едзена было зімовым сном.

Радасць мітусні і стому працы
умясціць хачу ў пражыты дзень.
Змораны патокам інфармацый
у бяздонны час лячу, як цень.

Даручэнняў я ўжо не чакаю —
іх не носяць веступы вясны,
на пейзаж мой попел асыпаюць
скрухі прадзімовай груганы.

Не цвіце вясны маёй палетак —
заглушыў раллю даўно дзірван.
Дзе ты бачыў, каб з букетам кветак
прылятаў груган?!

Чую ў дзверы стук папераджальны —
з кветкамі груган не прыляціць!
Пакарылі нетры мы і далі,
толькі час не можам супыніць.

Што ўпусцілі, што недаглядзелі —
аплаціць рахункі трэба нам.
Дык няхай ракой плывуць падзеі,
у гісторыі згубіўся лік гадам.

Пастаянна ў клопатах штодзённых
гаркату надзей нязбытных п'ём.
Пастаянна ў пачуцці шалёным,
бы ў агні, згарае дзень за днём.

А калі памылішся ты ў чымсьці,
захмялелы ад сардэчных бур,
кожны дзень свой зноў пісаць вучыся
хутка, страсна і без карэктур.

# На дарогу

Чуем вырак мы людзей бывалых:
«Выпусцілі з колбы джына шалу».

Тысячы маленькіх герастратаў
бегаюць з паходнямі заўзята,

кожны хоча знакамітым быць,
штосьці знішчыць, штосьці падпаліць.

«Выпусцілі з колбы джына шалу!
Выпусцілі з колбы джына шалу!..»

Словы гэтыя, як гром над галавой,
гоняцца за мной і за табой.

Некалі хацеў Шэкспір-нябога
свет паставіць з галавы на ногі.

Сёння ж мала быць героем часу,
задыхацца ад урану й чаду.

Стачкі, дэманстрацыі, пратэсты —
форма дасканалая без зместу.

Радуйцеся, што Зямля-планета
шчэ не развіталася з Сусветам.

Моц тысячарукіх ураганаў
гоніць нас у новы свет нязнаны,

дзе да шчасця сіла маладая
сцежак непратоптаных шукае.

Большай подласці не можа ў свеце быць —
каб і жыць і свайго краю не любіць.

Адчуваем, што пад нашымі рукамі
дрэмлюць тысячы магчымасцей вякамі,

толькі трэба менш на лаўрах спачываць,
а магчымасці ўсе тыя адшукаць

і раней, чым тройчы кукарэкне певень,
праўды боскай раскусіць арэх даспелы,

верыць: лёс надзею нам пакінуў —
выехаць з абрыдлай каляіны.

# Допіс

Сябры, як жа намі валодае час!
Няўлоўны, няўмольны, цякучы,
хвілінкі адной не дае на папас,
цябе ён і мучыць, і мучыць...

Сядзіш за нязменным сталом дзень у дзень,
нязменныя вечна варункі...
За лета ссівелі і сталі радзець
твае валасы і думкі.

А час ці ж дазволіць на месцы стаяць:
за снежнай зімою, за летам з буслામі
бяжыш і не рупішся нат адчуваць,
як наша планета дрыжыць пад нагамі.

Не кожная песня душу залаціць.
Пражыць немагчыма спакойна і сціпла:
Штодня штось трывожыць і нешта баліць,
і нехта на раны соль сыпле.

Мелюць і мелюць млыны катастроф —
шмат вотруб'я, мала пытлёўкі...
І тонкую скуру тваю без слоў
выдубіць хтось, як дублёнку.

Думаў: жыцця ўсе сакрэты спазнаў,
магу павучыць і суседзяў,
ды раптам паўстане глухая сцяна —
ілбом не праб'еш, не аб'едзеш.

Жыць жа — не толькі сядзець за сталом,
штаны праціраць і не толькі
ліцца на рунь шчодрым слоўным дажджом,
чакаючы боскай вясёлкі.

Калі не ўшануеш сваіх каранёў,
засохне і верхавецце.
Цела ж тваё — ці ўспыхне агнём,
ці стане звычайным смеццем.

# Каму радасць

Што меў — аддаў. Нічога больш няма,
хіба што — мары ды яшчэ надзеі.
Згарае восень, а наперадзе — зіма
і дні ўсё карацеюць, карацеюць.

Няхай мяне праймае стынь рабін,
пражытае жыццё я аглядаю.
Хто добра працаваў і шмат зрабіў,
той хутка і салодка засынае.

А час, ён, кажуць, знае, на каго
паслаць пяшчоту, на каго — халеру.
Ён кожнаму за ўчынкі ўсе яго
заплаціць і адплаціць поўнай мерай.

Не трэба нейкіх там крутых расправ,
не трэба і маральных асіметрый,—
каб толькі крывадушнік задрыжаў,
як ліст асінавы пад ветрам.

Хто бачыць шлях да найсвяцейшых мэт,
не спыніцца ён дзесь на паўдарозе.
а радасць — той надзейны інструмент,
што рукі працавітыя залоціць.

## Ёсць закрытая кніга страт

У старасці мала што можа ўжо ўзрушыць.
Жыццё — па вуголлі ідзеш басанож.
З праклёнамі, лёсткамі звыкліся вушы,
у вочы плююць, а ты думаеш — дождж.

Радні ўжо няма. А сябры прыязджаюць
з куфэркамі, поўнымі дробненькіх здрад,
бязгучна жывуць і бясследна знікаюць,
адвёўшы пагляд.

Ёсць кніга закрытая страт чалавецтва,
не толькі для формы — каб зыск нейкі мець.
Вядома, са сподка ніяк не наесца
худы, за зіму згаладалы мядзведзь.

Раструшчыш зашчэпкі, замкі і засовы,
глядзі, каб мацнейшых не сталі каваць,
вядзі баразну сваю ў полі вясновым,
умей з арлекіна бразготкі сарваць.

Для некалькіх слоў адкапаеш крыніцу,
дыханнем адгоніш слату чорным хмар,
для шчасця нашчадкаў вучыся мірыцца
і ў сэрцы гасіць пачуццёвы пажар.

А як з мітусні-траскатні паўсядзённай
шэдэўр выціскаю — не ведаю й сам.
Ды кожны паверыць: здзяйсняецца сёння
усё, пра што гэтулькі снілася нам.

# Пад жнівеньскім небам

Неба здаецца ракой, па якой,
бы качаняты, плывуць аблокі.
На тонкіх галінках над галавой —
грушы, як зоркі ў небе высокім.

Сціплы пейзажык скошаных ніў
з ліпай дуплістай на цёплым пагорку
сотні разоў мо наскрозь прапаліў
памяць маю каляровай вясёлкай.

Гэта, я ведаю,— зроку падман,
бо паўстагоддзе ляжыць паміж намі,
і паўстагоддзе, нібы праз туман,
тыя далёкія дні ўспамінаю.

Бо паўстагоддзе і сам жарабком,
выгнаным пугай, нібыта з нябыту,
рэзка кудысьці бягу бальшаком,
спяваю па нотах, даўно ўжо забытых.

Лета і восень стаяць уваччу
капуснымі ў шорах лістамі.
Я ж, састарэлы ўжо конь, лячу,
сціснуўшы цуглі зубамі.

Чую наперадзе ляскат падкоў —
апошнія дні-жарабкі мае скачуць.
Толькі нікога ўжо з тых жарабкоў
мне не дагнаць, хоць я ў поце гарачым.

Змест

*Хведар Жычка.* Шматколерная, як вясёлка, паэзія — 3

З ПЕРШЫХ КНІГ
1939—1957

Юнацкая песня — 8
Вясновы матыў — 9
Пазнанні — 10
Просьба — 12
Развітанне — 13

*Са зборніка*
«РАНІШНІ ПОЕЗД НАДЗЕІ»
1958

Дворык — 16
Доўгі вясновы дзень — 20
Незакончаны верш — 21
Жаданне — 22
Развітанне — 24
Хацеў бы быць... — 26
Гэтай парой — 28
Сталінград а чацвёртай гадзіне раніцы — 30

*Са зборніка*
«ВІТАЮ ВАС, ВОКНЫ!»
1962

Вітаю вас, вокны! — 36
Што ўбачыў жнівень у тваіх вачах — 37
Ода — 38
На дружбу — 39
Спроба намаляваць партрэт — 41

*Са зборніка*

## «ВЯСТУН ПРЫХОДЗІЦЬ ПЕША»

1968

Восень — 44
Сон, які вяртаецца да мяне з канца вайны — 46
Партызанскае — 48
Украдзеным пяром — 50
Калі пішаш — 51
Кароткі курс лятання — 52
Вястун прыходзіць пеша — 54
Летапіс — 56
Год за годам — 58
Яшчарка ў траве — 59
Хто — 60
Ламікамень — 61
Асенні вечар — 63
Парастак — 64

*Са зборніка*

## «ШТО БЯРУ Ў ДАРОГУ»

1975

Сіні надвячорак — 66
Здабыча — 67
Ужо вясна тут... — 69
Кірмаш — 71
Павярнуць ключом — 72
Радзіма — 73
Ненія — 75
Рэчка ў горадзе — 77
Азіранне — 78

*Са зборніка*

## «АГОНЬ СПЯШАЕЦЦА»

1979

У чатырох сценах — 80
Твае аблокі несці — 81
Цяжар — 82
Пражская вясна — 83
Дубленне — 85

Вяртанне — 86
Між намі — 89
Спажыўцы — 91
Пісьмо — 93
Шчасце — 95
Далёка і блізка — 97

*Са зборніка*

«БЕРМУДСКІ ТРОХКУТНІК»
1982

Не хачу! — 102
Бермудскі трохкутнік — 103
Галавакружэнне — 104
Дзень без цябе, дзень без паэзіі — 105
У гэтую хвілю — 106

*Са зборніка*

«КАЛЯНДАР»
1986

Гісторыя кахання — 114
Апакаліпсіс — 116
Галасы — 118
Нарэшце — 119
Імгненне — 120
Дарога — 121
Усё часцей — 122

*Са зборніка*

«ГРУГАН НЕ ПРЫЛЯТАЕ З БУКЕТАМ»
1988

Не ўпершыню вясна — 128
Зноў і зноў — 129
Інтуіцыя — 130
Груган не прылятае з букетам — 131
На дарогу — 133
Допіс — 135
Каму радасць — 137
Есць закрытая кніга страт — 138
Пад жнівеньскім небам — 139

**Скала І.**

С42 Вітаю вас, вокны!: Вершы /Прадм. і пер. з чэш. Хв. Жычкі.— Мн.: Маст. літ., 1995.— 142 с.— (Паэзія народаў свету).

ISBN 985-02-0098-7 (беларус.).

Творчы шлях аднаго з самых вядомых сучасных паэтаў Чэхіі Івана Скалы (нар. 1922 г.) адзначаны няспынным, падчас драматычным пошукам, напружаным імкненнем да новага, да глыбіні і дакладнасці думкі і вобраза. У яго творах падкрэслена любоў да жыцця, узмоцненая трывогай за захаванне міру.

**С** $\frac{\mathbf{8850000000-046}}{\mathbf{М302(03)-95}}$ **112—95** **ББК 84(4Чеш)**

Літаратурна-мастацкае выданне

**Скала Іван**

***Вітаю вас,***
***вокны!***

Вершы

Рэдактар І. П. Дабрыян. Мастак С. В. Чарановіч. Мастацкі рэдактар А. І. Цароў. Тэхнічны рэдактар М. Ц. Папкова. Карэктар Я. Ф. Харко.

Здадзена ў набор 26.07.94. Падп да друку 09.02.95. Фармат $70 \times 90^{1}/_{32}$. Папера афс. № 2. Гарнітура літаратурная. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 5,27. Ум. фарб.-адб. 5,56. Ул.-выд. арк. 4,40. Тыраж 1000 экз. Зак. 725.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ №3. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Друкарня «Перамога», 222310, Маладзечна, вул. Таўлая, 11.